Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 01 (2799) Год LV | Беласток, 3 студзеня 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

З'езд-опера

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Пралог (Andante)

20 снежня 2009 года ў Беластоку адбыўся XVI з'езд Беларускага грамадска-культурнага таварыства. Мерапрыемства адкрыў старшыня Галоўнага праўлення Ян Сычэўскі. Пасля кароткіх уводзін наконт сітуацыі Таварыства старшыня прадставіў гасцей з'езду. Мерапрыемства ўдастоілі дэпутат Сейма Рэчы Паспалітай Яўген Чыквін, прадстаўнік беластоцкага праваслаўнага архіепіскапа Якава а. Рыгор Місіюк, прадстаўнік амбасады Рэспублікі Беларусь у Польшчы Васіль Чэрнік, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Міністэрства культуры РБ Ірына Лемцюгова, генконсул РБ у Беластоку Міхал Аляксейчык і консул Тацяна Мікалаёнак, намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама прафесар Ігар Жук, дырэктар Цэнтра культуры Беларусі Аляксандр Карачун і іншыя прадстаўнікі дзяржаўных беларускіх устаноў з Беларусі і Польшчы. З польскіх чыноў з'явіўся ўпаўнаважаны падляшскага ваяводы па справах нацыянальных меншасцей Мацей Тэфельскі, а рознамаштабныя мясцовыя самакіраванні Беласточчыны прадстаўлялі толькі Вольга Рыгаровіч і Раіса Раецкая — войты гмін Гайнаўка і Бельск-Падляшскі. Ян Сычэўскі паінфармаваў, што на з'езд прыехала 44 з ліку 57 выбраных дэлегатаў, што абазначае легітымнасць з'езду.

Мітрат Рыгор Місіюк сказаў, што незалежна ад вопраткі мы ўсе дзеці Божыя. А ў калядны час відаць, што многія — заміж зрабіць у сэрцы месца для дабра — пхаюцца да жолаба. Прамоўца засцярог, што гэта не адносіцца да кіраўніцтва Таварыства, бо яно здзяйсняе немагчымае. Прыгадаў ён таксама пачаткі сваёй прапаведніцкай працы на Беластоцкім радыё. Вось пасля першых перадач паклікаў яго да сябе тадышні загадчык радыёстанцыі і паінфармаваў, што тэлефанавалі яму жанчыны і абураліся: „Jak można takie audycje dawać — przecież to dzieci słuchają!" А што было б, калі б заміж тых махеравых берэтаў пазваніў нехта больш важны?..

Генконсул РБ у Беластоку Міхал Аляксейчык паінфармаваў пра падтрымку Консульствам беларускай асветнай выдавецкай дзейнасці ў Польшчы. Выказаў ён жаль, што БГКТ не мае сваіх сродкаў масавай інфармацыі. Бо ў „Часопісе" і „Ніве" больш гаворыцца пра праследаванні палякаў у Беларусі. Калі спадар Аляксейчык упершыню стаў на працу ў Польшчу, а гэта было больш за дваццаць гадоў таму, гаварылася пра 400 тысяч беларусаў у Польшчы і столькі ж палякаў у Беларусі. А апошнім часам маем 43 тысячы беларусаў на Беласточчыне і больш мільёна палякаў у Беларусі — бо з'явілася Карта паляка. Дык дзе каго праследуюць?! Спадар Аляксейчык заахвочваў інтэлігенцыю пісаць і ў „Ніву", і ў „Часопіс". Вось тыдзень раней была падпісана дамова Гродна — Беласток і толькі адна „Gazeta Wyborcza" змясціла невялікую заметку пра гэта здарэнне, а іншыя беластоцкія штодзённікі нічога. Часта наракаем на Радыё Рацыя, але яно дало пра гэтую падзею некалькі перадач. Генконсул выказаў заклапочанасць узаемаадносінамі паміж беларусамі Беласточчыны, якія нагадваюць растапыраныя пальцы. Заахвочваў ён да размоў, бо ўсё пачынаецца з размовы.

Дэпутат Сейма Яўген Чыквін дадаў, што дэзінтэграцыя беларускага асяроддзя дасягнула такой ступені, калі ўжо немагчыма выпрацаваць супольнай пазіцыі ў найважнейшых справах, напрыклад, у справе надта для беларусаў Беласточчыны істотнай пашырэння нацпарку ў Белавежскай пушчы ці размяшчэння радыеактыўнай звалкі каля Крушынян. Беларусы — як адзіная нацыянальная меншасць у Польшчы — не могуць таксама выпрацаваць стратэгіі навучання сваёй мовы ў школах.

Далей старшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі зачытаў справаздачу Галоўнага праўлення з дзейнасці арганізацыі ў міжз'ездаўскі перыяд. Паколькі з боку актыву Таварыства чуваць пастаянныя закіды на яго масмедыйную дыскрымінацыю, прапаную пазнаёміцца з абшырнымі ацэначнымі вытрымкамі з гэтага дакумента.

Вытрымкі са справаздачы ГП БГКТ за кадэнцыю 2006-2009 (Vivace)

Беларускае грамадска-культурнае таварыства на свой XVI з'езд прыходзіць пасля чарговай 4-гадовай дзейнасці з пачуццём вялікай пагрозы татальнага знішчэння нашай культуры і з тым большай адказнасцю за яе лёс у надзвычай цяжкія часы і таксама за яе бліжэйшую і больш адлеглую ў гістарычным плане будучыню.

Здарэнні 2006 года гэта мэтанакіраваны разгром беларускай культуры. Паслядоўнасці антыдэмакратычных рашэнняў Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі мы перажываем і адчуваем з вялікім болем да сёння. Трэба прыпомніць, што калі ў ліпені 2006 года Галоўнае праўленне атрымала інфармацыю аб пакаранні спыненнем датацыі на тры гады, а ў 2009 годзе аказалася, што датацыю міністэрства спыніла амаль на чатыры гады і пры тым забрала нам выпрацаваныя фінанса-

працяг ☞ 11

Тыгр у дрымоце ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Паводле ўсходняга гараскопа новы 2010 год пройдзе пад знакам тыгра. Жывёла ў нашых шыротах у натуральным асяроддзі невядомая і досыць загадкавая. А значыць і цяжкапрадказальная. Беларусы, бадай, ад новага года нічога асаблівага і не чакаюць. Тыгр нашай надзеі ў глыбокай дрымоце, ён сапраўды стаміўся, ён спіць. Надзея ў людзей, як звычайна, найперш на саміх сябе. У скок „папяровага тыгра" айчыннай эканомікі не верыць ніхто. Хіба толькі кошты будуць скакаць...

Басейн у Гайнаўцы ☞ 4

Аляксей МАРОЗ

Ева з Чыжоў ☞ 5

Міра ЛУКША

9 770546 196000

Тыгр у дрымоце

Паводле ўсходняга гараскопа новы 2010 год пройдзе пад знакам тыгра. Жывёла ў нашых шыротах у натуральным асяроддзі невядомая і досыць загадкавая. А значыць і цяжкапрадказальная. Беларусы, бадай, ад новага года нічога асаблівага і не чакаюць. Тыгр нашай надзеі ў глыбокай дрымоце, ён сапраўды стаміўся, ён спіць. Надзея ў людзей, як звычайна, найперш на саміх сябе. У скок „папяровага тыгра" айчыннай эканомікі не верыць ніхто. Хіба толькі кошты будуць скакаць. Зразумела, што толькі ў адзін бок. Цэны гарэлкі, мяса і цыгарэт — амаль асноўных для беларусаў прадуктаў — выраслі ўжо перад новым годам. Эксперты прагназуюць і паніжэнне коштаў некаторых відаў тавараў, але звычайнаму абывацелю ў гэта паверыць цяжка. Не прыгадваецца папросту такіх прыкладаў.

У палітычным жыцці Рэспублікі Беларусь цэнтральнай падзеяй стануць выбары ў мясцовыя саветы. Еўропа нібыта чакае ад кіраўніцтва дзяржавы абяцанай лібералізацыі. І калі моцна захоча, то ўгледзіць і гэтую палітычную лібералізацыю і яшчэ якія станоўчыя зрухі. Вось нібыта і ў заканадаўстве фармальна важныя змены зрабілі. Але ж зусім не верыцца хоць бы ў больш-менш роўныя магчымасці ахвотных стаць дэпутатамі мясцовых органаў самакіравання. Лакмусавай паперкай стане ўжо фармаванне выбарчых камісій. І вельмі сумнеўна, што туды пусцяць апазіцыйных актывістаў. Чакаць „моманту ісціны" ўжо зусім нядоўга.

Безумоўна зноў працягнецца палітычны „флірт" з „братняй" Расіяй. Гульня гэтая традыцыйна небяспечная і традыцыйна пройгрышная для Беларусі. У старажытнай і найноўшай гісторыі яшчэ не было такіх прыкладаў, каб хтосьці выйграў ад блізкага сяброўства з расійскай дзяржавай. А яна ўсё больш становіцца імперскай і агрэсіўнай. Там напоўніцу расце сапраўдная дыктатура з дзвюма галовамі на чале. З падзей у суседзяў найбольш цікава будзе назіраць выбары прэзідэнта ва Украіне. Дэмакратыя ў нашай паўднёвай суседкі ўкараняецца досыць хваравіта і балюча, а кожны негатыўны досвед, кожны адмоўны прыклад рыкашэтам б'юць і па свядомасці беларускага выбаршчыка, які ўжо звык баяцца ўсяго, а найбольш перамен.

У гістарычным календары надыходны год будзе адзначаны 600-мі ўгодкамі Грунвальдскай бітвы. Цікава, ці зверне ўвагу на дату 15 ліпеня сённяшняя беларуская дзяржава? Для беларускай грамадскасці важнымі будуць і 100-ыя ўгодкі з дня нараджэння паэткі Ларысы Геніюш. Імя гэтай вялікай грамадзянкі і патрыёткі, якое прыбіраюць з падручнікаў ідэолагі-цяперцы, зноў трэба вяртаць суайчыннікам. З гадавін менш круглых, але досыць важкіх, варта ўзгадаць усе тыя дэмакратычныя заваёвы, якія здабыла Рэспубліка Беларусь роўна дваццаць гадоў таму — у 1990 годзе, які зараз успамінаецца з нейкай настальгіяй, трымценнем. Беларуская мова тады яшчэ Вярхоўным Саветам БССР была абвешчана ў Беларусі адзінай дзяржаўнай. А праз некаторы час прынята была Дэклярацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь. Падала заслона, беларусы адкрывалі для сябе еўрапейскую прастору, новы свет, беларусаў з іншых краін. Усталёўваліся сяброўскія кантакты паміж суайчыннікамі па абодва бакі мяжы. Маладыя беларусы Беласточчыны паехалі ў Мінск і іншыя гарады па навуку. Бо ў новай, сваёй дзяржаве ствараласа беларуская адукацыя, беларуская школа. Гэта быў час вялікага абуджэння грамадства, адраджэння культуры і гісторыі. Час грамадскай актыўнасці і асабістага разняволення. Час змены свядомасці і мыслення. Час будовы свайго ладу ў сваёй краіне. Менавіта так бачыцца гэта праз дваццаць гадоў. Вось так, хацелася пагаварыць пра бліжэйшае будучае, а ўрэшце прыгадалася нядаўняе мінулае. Проста, так хочацца абуджэння ад летаргіі, так хочацца новых шанцаў для краіны, якую мы ўсе любім. З Новым годам, сябры!

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

„Бог даў мне сілу і красу..."

16 снежня споўнілася 70 гадоў з дня нараджэння беларускага паэта Зьніча (Алега Бембеля).

У Жыровічах адбылася творчая вечарына, прысвечаная паэту Зьнічу (Алегу Бембелю, інаку Мікалаю). Яе адкрыў сам юбіляр і прапанаваў паглядзець дакументальны фільм пра яго жыццё і дзейнасць. Фільм рэжысёраў Аляксандра Налівайкі і Андрэя Куцілы мае назоў „Паэма веры".

Пасля фільма Алег Бембель чытаў свае філасофскія і лірычныя вершы, прысвечаныя пошукам сэнсу зямнога жыцця.

Алег Бембель (інак Мікалай) жыве ў Жыровічах, з'яўляецца насельнікам Жыровіцкага Свята-Успенскага манастыра. Сюды яго лёс прывёў трынаццаць гадоў таму. Інака Мікалая часта можна ўбачыць на вуліцах нашага горада. Ён часта і ўпэўнена крочыць шырокай хадой, найперш у мясцовую друкарню, дзе паэт выдае не толькі свае ўласныя творы, але і рэдагуе багаслоўска-літаратурна-мастацкі лісток „Жыровіцкая абіцель". Часам інака Мікалая можна сустрэць у Слонімскай гімназіі, дзе яго любяць і паважаюць гімназісты і настаўнікі, дзе ён, кажучы словамі паэта, „малітву патаемную ў прыцемках шэпча".

Алег Бембель нарадзіўся ў Мінску ў сям'і народнага мастака Беларусі Андрэя Бембеля. Скончыў Мінскае музычнае вучылішча імя Міхаіла Глінкі і Беларускую дзяржаўную кансерваторыю імя Анатоля Луначарскага. Пэўны час настаўнічаў, працаваў навуковым супрацоўнікам Інстытута філасофіі і права Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а таксама ў Нацыянальным навукова-асветным цэнтры імя Скарыны.

Як філосаф-публіцыст і як паэт Алег Бембель адбыўся на памежжы 1970-1980-х гадоў, калі пачалі з'яўляцца ў рэспубліканскім друку яго першыя вершаваныя публікацыі. З 1988 года за Алегам Бембелем замацоўваецца яго сталы псеўданім Зьніч, а яго паэзія акрэсліваецца пераважна ў інтэлектуальным рэлігійна-быційным напрамку. Яго асноўнымі тэмамі і матывамі паэзіі з'яўляюцца хрысціянская ідэя міласэрнасці, вымярэнне з'яў і падзей жыцця, учынкі і памкненні людзей, роздум над лёсам Бацькаўшчыны і беларускага народа:

Мы прывыклі неяк не па-людску
Пра матывы сэрцаў меркаваць:
Можна нішчыць Беларусь
па-беларуску...
Можна па-расейску — ратаваць...

Першыя зборнікі вершаў Зьніча выйшлі не ў Беларусі: „Рэха малітвы" — у Нью-Йорку, „Саната ростані" — у Беластоку. А першы зборнік вершаў на Радзіме „Малітвы за Беларусь" пабачыў свет у 1989 годзе.

Сёлета ў Слонімскай друкарні з'явілася яго новая паэтычная кніга „Мне не цябе шкада — а тваю маці...". Гісторыка-філасофская элегія ў вершах адрасавана найперш сучасніку, яна дапаможа ва ўласным роздуме аб нашых зямных сцяжынах і паразважаць аб краіне, у якой мы жывем:

Пад завірухай кроў ліецца...
Вятрыска — памяць расхістаў...
О, Беларусь, ці станеш сэрцам
Укрыжаванага Хрыста?..

Што датычыць філасофскіх разважанняў Алега Бембеля, то самым грунтоўным творам філасофскай публіцыстыкі з'яўляецца яго кніга „Роднае слова і маральна-эстэтычны прагрэс", якая ў 1985 годзе была надрукавана ў Лондане. Яна прысвечана лёсу і сучаснаму стану беларускай мовы, крытычнасць якога была відавочнай для аўтара, і ён сярод нешматлікіх абаронцаў мовы ў тыя гады заклікаў да яе выратавання. Але, на жаль, мову нашу родную прыходзіцца ратаваць і сёння.

На вечарыне, прысвечанай 70-годдзю Зьніча, юбіляр іграў паланез Агінскага „Развітанне з Радзімай" і кожнаму прысутнаму падараваў свой новы паэтычны зборнік. А мы пажадалі яму здароўя, натхнення, а Бог каб яму яшчэ даў сіл і красы на доўгія-доўгія гады.

Сяргей ЧЫГРЫН

Вачыма еўрапейца

Масты „Пагранічча"

Перад святам Раждаства па грыгарыянскім календары Ян Квасоўскі — прэс-сакратар падляшскага маршалка Яраслава Дважанскага, разаслаў па рэдакцыях таямнічыя запрашэнні на прэс-канферэнцыю. Заахвочваў у іх да ўдзелу, аднак, не рассакрэчваў, чаму дэталёва мае быць яна прысвечана. Таямніцу агучыў супольна з маршалкам Дважанскім Кшыштаф Чыжэўскі, шэф сейненскага Фонду і Асяродка мастацтваў, культур і народаў „Пагранічча". Справа — як абодва гаварылі журналістам — у спалучэнні інаўгурацыі паўгадовага старшынявання Польшчы ў Еўрасаюзе (ад студзеня 2011 г.) з надыходзячай дзень раней сотай гадавінай з дня нараджэння лаўрэата літаратурнай Нобелеўскай прэміі Чэслава Мілаша.

— Ідэяй зацікавілі мы міністра Радаслава Сікорскага [МЗС — М. Х.], а таксама кіраўніка ведамства культуры Багдана Здраеўскага і міністр Барбару Кудрыцкую [міністр навукі — М. Х.]. Маем надзею на стварэнне шырокага фронту для рэалізацыі гэтых дзеянняў, ахопліваючых падляшскіх парламентарыяў і самаўрадаўцаў, — інфармаваў маршалак.

Кшыштаф Чыжэўскі падкрэсліваў, прыводзячы ідэю задумы, накіраванай міністру Сікорскаму:

— Супадзенне гэтых дат без сумненняў можам выкарыстаць дзеля ўзбагачэння праграмы польскага старшынявання. Чэслаў Мілаш, а перш за ўсё культурная спадчына, якая з гэтага вырастае і якой з'яўляецца прадаўжальнікам, знакаміта ўпісваецца ў выклікі, перад якімі стаіць Еўропа.

Пры нагодзе аказалася, што якраз 30 чэрвеня 2011 г. (у гэтую круглую гадавіну з нараджэння Чэслава Мілаша) мае быць здадзены ў карыстанне пасля рамонту дварок у Краснагрудзе, сядзіба Асяродка „Пагранічча" і месца, у якім праводзіў быў канікулы малады будучы лаўрэат літаратурнай Нобелеўскай прэміі. Плануецца, што гэтае месца будзе ахоплена патранажам ЮНЕСКА і ўзнікне там Міжнародны цэнтр дыялогу імя Чэслава Мілаша; адбудзецца гэта ў годзе, аб'яўленым (праўдападобна) парламентамі Польшчы і Літвы Годам Чэслава Мілаша. Як сказаў Кшыштаф Чыжэўскі, мела б гэта быць першая на кантыненце „школа будаўнікоў мастоў, якая будзе адукаваць практыкаў дзейнічаючых на пагранічча".

— Еўропа штораз больш нагадвае архіпелаг асобных культур. У сувязі з гэтым Мілашава „Радзінная Еўропа" стане зноўку вельмі актуальнай тэмай, — адзначыў кіраўнік „Пагранічча". — Праблемай становіцца супольнасць Еўропы як цэласці, удамаўленне ва ўсёй Еўропе ўсіх еўрапейцаў. Каб надаць гэтаму працэсу рэальны ход, патрэбны дзеянні, якія можна ахапіць лозунгам „Еўропа мастоў".

Дадаў прытым:

— Польшча мае шанц прадставіць на еўрапейскім форуме сваю шматкультурную спадчыну ў даўгахвалевай справе будавання добрасуседскіх адносін з народамі, ад якіх аддзялялі нас войны, прадузятасці і таталітарызмы. Гэтыя традыцыі ўсё недастаткова вядомы ў Еўропе.

Ідэя Кшыштафа Чыжэўскага, падтрымліваная маршалкам Дважанскім, надзвычай слушная і каштоўная. Не магу, аднак, пазбыцца ўражання, што пры рэалізацыі лозунга „Еўропа мастоў", кінутага Чыжэўскім, могуць быць пабочна патрактаваныя краіны і народы, а затым культуры краін, якія, напрыклад, з'яўляюцца, г.зв. суб'ектам еўрасюзнай праграмы „Усходняе партнёрства", між іншым Беларусі. Спадзяюся, аднак, што лозунг „Еўропа без бар'ер", які спадарожнічае польскаму старшынянню ў ЕС ды адзін з прыярытэтаў гэтага старшынявання, якім мае быць рэалізацыя якраз „Усходняга партнёрства", не будуць забытымі ў Краснагрудзе.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Край — мара. Не для ўсіх, зразумела. Багата, але холадна, бо цягне ад поўначы і ад Паўночнага мора. Можна нават параўнаць з Польшчай: тут мора, горы і азёры. Але асаблівасці краявіду Нарвегіі гэта, мабыць, і адзінае, што асацыюецца з Польшчай, у якой нам прыйшлося жыць, так як Ані і Агаце. Яны аднак з цяжкасцямі перабраліся праз мора і вырашылі жыць па-новаму. Толькі ці напэўна зараз гэта дзеля грошай?

Жыццё праз шыбу

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

— Не хапае тут ужо ведаць толькі англійскую мову, — тлумачыць Аня з Беластока. — Ну, можа калі ты працуеш кухарам.

— А і то не заўсёды, — дадае Агата, родам з-пад Вроцлава.

— Зусім нядаўна я паспяхова здала экзамен, штосьці з роду B1 па англійскай мове, — ганарыцца Аня. — Гэта мне безумоўна дапаможа. Але ведаеш, часам на працы хтосьці да мяне загаворвае, а я ўцякаю думкамі ў свае польскія справы і ўвогуле не чую, што нехта мяне кліча.

Край — мара. Не для ўсіх, зразумела. Багата, але холадна, бо цягне ад поўначы і ад Паўночнага мора. Можна нават параўнаць з Польшчай: тут мора, горы і азёры. Але асаблівасці краявіду Нарвегіі гэта, мабыць, і адзінае, што асацыюецца з Польшчай, у якой нам прыйшлося жыць, так як Ані і Агаце. Яны аднак з цяжкасцямі перабраліся праз мора і вырашылі жыць па-новаму. Толькі ці напэўна зараз гэта дзеля грошай?

Паехаць на далёкую поўнач, асабліва зімой... Марылася гэтае мне больш-менш так моцна, як наведаць схаваную ад свету Трансільванію ці гарачую Кубу. Танныя авіябілеты дазволілі дабрацца ў Нарвегію хутчэй, чым мы думалі, але аказалася, што на пераломе лістапада і снежня сапраўдная зіма сюды яшчэ не прыйшла. Каб дабрацца на далёкую поўнач, трэба было б заплаціць у пару разоў болей, чым каштавалі нашы квіткі з Польшчы ў Осла. Тады мары пра Тронхейм ці палярныя краявіды чакаюць лепшых часоў. Таму мы вырашылі добра пазнаць тое, што для нас здавалася прывабным вакол старажытнага гарадка Тонсберг. Дні былі ўжо вельмі кароткія, бо сонца ўзыходзіла каля дзевяці раніцай, а хавалася пасля пятнаццатай, таму турыстычныя маршруты мусілі быць перадуманыя і хутка „выходжаныя". Тонсберг засяляе каля 35 тысяч жыхароў, таму і няма там як траціць зашмат часу, можа толькі, каб дабрацца ў цэнтр. Аказваецца, працоўныя з бяднейшых краін Еўропы часцей за ўсё засяляюць, так бы мовіць, прыгарадныя раёны (часта называныя праз іх вёскамі).

— Жывучы ў Брэке, эканомлю каля дзвюх тысяч злотых у месяц у параўнанні з кватэрай бліжэй цэнтра, — хутка пералічвае Аня. — Нават дарагія даезды не мяняюць сітуацыі.

Для прыкладу, праезд васьмі кіламетраў на грамадскім транспарце з Брэке ў цэнтр Тонсберга каштуе трынаццаць злотых. А месячны праязны білет больш карысны, чым аднаразовыя бідеты на праезд, нават у параўнанні з цэнамі ў польскіх гарадах.

— Мы сабе тут часта дапамагаем, — супакойвае нашае здзіўленне Аня. — Мяне часта на працу падвозіць знаёмая полька. Агата таксама мае машыну, тады супольна ездзім на аэробік ці пакупкі. Агата зараз і на Каляды едзе ў Польшчу на машыне! — цешыцца нашая сяброўка Аня.

— Еду, бо трэба падрамантаваць машыну, а тут, як сабе ўяўляеце, механікі вельмі дарагія. Аня цешыцца, бо на машыне няма абмежаванняў вагі багажу, як у самалёце, тады можна прывезці шмат ежы, патрэбных рэчаў і, зразумела, алкаголю (у Тонсбергу працуе толькі адна крама з мацнейшым алкагольнымі напоямі, адкрытая да ранніх пасляабедзенных гадзін).

Некалькі дзесяткаў кіламетраў да парома, пасля шэсцьсот кіламетраў шведскіх краявідаў, зноў на паром ды яшчэ чатырыста да Вроцлава.

— Хочацца табе?

— Гэта паніжае кошты жыцця, — смяецца Агата.

Эмігрантам гэта часам неабходнае, калі прабуюць эканоміць грошы. Зараз часцей стараюцца жыць „нармальна": пакупкі, клубы, аэробік, імпрэзы, экскурсіі. Як нарвежцы. Як самі кажуць, ужо шкада часу, каб пералічваць кожную крону, кожны злоты. Трэба жыць.

Затое мы рознымі спосабамі паніжалі кошты свайго адпачынку. Напрыклад, куплялі таннейшы хлеб. Нешта з роду беларускіх батонаў, там лічаны па якасці горшым, не каштуе дванаццаць, толькі шэсць злотых. Да гэтага крэветкі, рыхтаваныя па-нарвежску, з кропчыкам, спецыяльным маянэзам, сокам з лімонкі, на хлябку. Крэветкі якраз можна дастаць удвая танней чым у нас. Згаданыя раней восем кіламетраў у цэнтр пару разоў прайшлі мы пешшу, але з прыемнасцю. Гэта добры момант, каб заглядаць нарвежцам у іхняе сямейнае жыццё. Думаеце, няёмка? Самі зацікаўленыя не супраць.

— Яны надта вёрткія як на мой густ, — нецярплівіцца ў сваіх расказах Аня. — Уяўляеш сабе, выходжу аднойчы з хаты, а гаспадары пытаюцца ці я маю хлопца? Проста так. Такое пытанне... Усё паказваюць, але таксама ўсё хочуць ведаць. Не разумеюць, што чужыя сабе людзі жывуць асобным жыццём.

Аня наймае гараж, Агата — падвал. Так нарвежцы падзарабляюць сабе дадатковыя грошы, хаця на заробкі яны не павінны наракаць (Аня прыбіраючы ў шпіталі ўдзень зарабляе каля чатырохсот злотых брута). Калі гаварылі мы з асобамі, якія працуюць і жывуць у нарвежцаў, можна між радкамі дачытацца, што лічаць гэтую сітуацыю нейкім паніжэннем.

— Калі я толькі стала вучыцца нарвежскай мове і недастаткова яе разумела, часам дагаворваліся мы па-англійску. Тады гаспадар іранічна, нават здзекліва, нагадваў, што мы тут на працы і трэба лепш старацца.

Калі мы так слухалі, адначасна ў думках дзякавалі сабе, што не прыйшло нам у галаву па ўзору іншых сяброў пераехаць за мяжу. Хаця мушу сказаць, што нагода пазнаваць людзей іншага менталітэту спакушае. Так як пазнаваць іншую культуру і мову пры нагодзе.

— Дык як з гэтай мовай? — дапытваюся.

— Вельмі цешуся, што маю гэтае пасведчанне, — з румянцамі на твары прызнае Аня. — Мае шансы на працу растуць. Зараз тут не так лёгка з працай. Думаеш, у шпіталі кожны можа атрымаць працу? Не, тут не так лёгка прыбіраць. Мне ўдалося, дзякуючы кантактам.

Нам таксама прыдаліся кантакты. Агата пазычыла нам машыну, каб наведаць Осла, распаложанае сто кіламетраў далей на поўнач (кошт квіткоў на грамадскі транспарт перарос наша ўяўленне, а бензін у „нафтавай краіне" якраз не такі дарагі). Вельмі хацелася нам пабачыць як выглядае адна з даражэйшых сталіц свету. Адчулі мы гэтыя цэны адразу на аўтастаянцы, але фінансавых шокаў, думаю, хопіць. Хуценька глянулі мы на палац манархаў, пашпацыравалі па прыгожых вуліцах горада ды наведалі амаль усе сучасныя музеі. Скандынавы асабліва славяцца сучасным дызайнам, таму вельмі прыемна глядзець архітэктуру ды розныя спосабы добраўпарадкавання прасторы. Аднак да гэтага народ мусіць ментальна даспець. Скандынавы якраз з гэтым праблемы не маюць. Іншыя рысы прыцягваюць увагу.

— Яны не з роду гасцінных нацый, — дыягназуюць нашы сяброўкі. — Усе справы вырашаюцца на парозе.

Цяжка нам у гэта паверыць, калі так чарговы раз тэпаем па знаёмым маршруце ў цэнтр Тонсберга. Направа абшаляваныя дошкамі домікі, рознакаляровыя, з агромнымі вокнамі накіраванымі ў бок вуліцы. Налева, як у люстры, падобны дызайн і празрыстае жыццё нарвежскіх сем'яў. Дзе-нідзе на стаўбах лунаюць нацыянальныя сцягі.

— Гэта абазначае, што ў гэтым доме святкуюць якраз, не толькі нацыянальныя святы, — тлумачаць нам „польскія спецыялісты па нарвежскай культуры".

* * *

У крамах ужо завіхаюцца Дзеды Маразы. Адчуваецца, што святы на парозе. „Юле-піва", „юле-каляндар", „юле-аранжада" ці „юле-салома". Усё ў іх „юле", значыцца, спецыяльна падрыхтаванае пад свята Нараджэння Хрыстовага. Нават тая ж салома. У нас можна купіць сена пад абрусак, а ў Нарвегіі, як калісь традыцыйна ў беларусаў, у хату прапануюць салому. Вельмі свойска адчувалі мы сябе ў такіх маркетах. Самае цікавае, што прадукты з прыстаўкай „юле-" наогул таннейшыя чым звычайныя. Гэта адзін са станоўчых бакоў, здаецца, крыху менш камерцыйнай культуры. Пазітыўна таксама настройваюць чароўныя краявіды. Пасля прыезду нашы гаспадыні забралі нас на канец свету. Verdens Ende — гэта месца, у якім добра думаецца і добра адпачываецца. У марозлівую нядзелю не толькі мы паехалі аглядаць адзін са шматлікіх канцоў свету. Былі там іншыя турысты, а на скалах сустрэлі мы бацьку з дзяцьмі, якім надвор'е нястрашнае. Шчыра кажучы, дзеці там выхоўваюць у вельмі свабодным стылі. Ні марозу, ні ветру, ні снегу, ні дажджу не баяцца. Можа таму і доктары не маюць там зашмат працы, а тыя, якія працуюць, паводле расказаў, сярэднеадукаваныя.

— Заходжу да доктара, — з жалем распавядае нам сяброўка, — а ён заглядае пры мне ў кніжкі ды на канец раздрукоўвае мне старонку з сайта „Дапаможнік для лекараў". Як тут верыць у яго прафесіяналізм? На ўсё прапісваць абязбольваючы лек.

Можа таму там жыццё проста не баліць?

Верны сябра „Нівы”

Напярэдадні Варвары (прыхадское свята ў Кузаве — 17 снежня) вечарам пазваніў тэлефон. З другога боку пачуўся мужчынскі голас, які адрэкамендаваў сябе як пастаяннага чытача „Нівы” з-пад Нараўкі.

— Пан Сідарук, — пачаў незнаёмец, — чытаю вашы артыкулы і хачу сказаць, што вам належыцца „шасцёрка”. Дасканала пішаце... Папытайце затым у Беластоку, чаму адмянілі беларускую радыёперадачу ў 18 гадзін? Пасля кароткай інфармацыі сталі перадаваць „Лісту пшэбояў”. Чаму так неакуратна ставяцца да беларусаў? На маю думку, — працягваў суразмоўца, — гэтую лісту і пазней маглі б перадаваць. Новы час пенсіянерам не падыходзіць. Хацелася б паслухаць як вестак з Беларусі, так і паглядзець навіны ў тэлебачанні. Зараз я вымушаны ад аднаго адрачыся...

Калі я папрасіў свайго суразмоўцу выявіць прозвішча, дык гэты паўторна заявіў:

— Чытач „Нівы”.

— А колькі вам год, калі гэта не сакрэт?

— Восемдзесят шэсць.

— Калі не хочаце выявіць прозвішча, дык скажыце хоць адкуль звоніце? — не здаваўся я.

— З Плянты.

— А я Плянту ведаю, — хуценька адказаў я, каб падтрымаць размову. — У канцы пяцідзесятых гадоў з мастацкімі калектывамі ў Нараўку заязджаў.

— Памятаю гэта. Я тады святліцовым на чыгуначнай станцыі працаваў. Я вас ведаю. Маё прозвішча Клімюк, ваш цёзка.

Зараз стала вядомым, з кім давялося мне гаварыць.

З Уладзімірам Клімюком неаднойчы мы сустракаліся на Плянце, бо я тады працаваў у маладзёжных арганізацыях і разам з Грышам Зданоўскім, таксама з Плянты, лічыліся актывістамі Павятовага праўлення Саюза вясковай моладзі. Неаднойчы прыходзілася гасцяваць у Грышавай хаце.

А з Уладзімірам Клімюком у пазнейшы час спалучыла нас праца на чыгунцы. У шасцідзесятыя гады я працаваў на перагрузачнай станцыі ў Семяноўцы, а ён — канторным начальнікам дарожнага аддзялення ў Нараўцы. Прыемна было зараз успомніць адлеглае мінулае, старога знаёмага, тым больш што па сённяшні дзень сяброўсія кантакты падтрымліваем праз „Ніву”. Спадар Клімюк прызнаўся, што з'яўляецца сталым падпісчыкам „Нівы”. Размова доўжылася некалькі мінут і завяршылася найлепшымі святочнымі пажаданнямі моцнага здароўя і самых лепшых поспехаў у сямейным жыцці.

Уладзімір СІДАРУК

Дапамога паліцыі

З пачаткам снежня Павятовая камендатура паліцыі ў Гайнаўцы атрымала новую машыну „Quad Polaris 800” з перадачай на чатыры колы з прызначэннем для патрулявання тэрыторыі Нараўчанскай гміны. Гэта будзе вялікая дапамога мясцовым функцыянерам, паколькі на такой машыне можна дабрацца ў найбольш недаступныя месцы. А такіх шмат у прыгранічнай паласе ў Нараўчанскай гміне. **(ус)**

Гайнавяне дачакаліся басейна

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

У час адкрыцця аквапарку ў большым басейне плавалі белліцэісты

Першыя планы будовы крытага басейна ў Гайнаўцы паявіліся ўжо ў палове васьмідзесятых гадоў, а гарадскія радныя і чарговыя бурмістры вярталіся да іх некалькі разоў. Будова велізарнага будынка басейна распачалася тры гады таму і з-за нястачы грошай была прыпынена на нейкі час. З вялікай вонкавай фінансавай дапамогай удалося ў гэтым годзе аднавіць будаўнічыя работы, пераадолець усе складанасці і 17 снежня 2009 года адбылося афіцыйнае адкрыццё Воднага парку, у якім побач вялікага і меншага басейнаў знаходзіцца шмат іншых водных атракцыёнаў. Гледзячы на аквапарк ад вуліцы Пілсудскага складаецца ўражанне, што ён прыклеены да вялікай гімнастычнай залы і такім чынам спалучаны з будынкам Гайнаўскага белліцэя. Сапраўды, паміж спартыўнай залай і басейнам пастаўлены дзверы і калі будзе згода дырэкцыі аквапарку, белліцэісты і белгімназісты будуць мець магчымасць у час заняткаў фізкультуры пераходзіць у памяшканне крытага басейна не выходзячы зімой на паветра, што з'яўляецца дадатковым вялікім козырам нашай школы. Аднак месца пад будову Воднага парку было выбрана не дзеля адной школы, а пад развагу бралася таксама блізкае распалажэнне філіяла Беластоцкага політэхнічнага інстытута і вялікіх жыллёвых кварталаў горада. Галоўны ўваход у басейн распалажаны ад вуліцы 3 Мая, пры вялікіх аўтастаянках.

Бурмістр Анатоль Ахрыцюк, адкрываючы мерапрыемства, асабліва дзякаваў маршалку Падляшскага ваяводства Яраславу Дважанскаму і яго ўстанове, праз якую праходзілі еўрасаюзныя сродкі, якія выдатна ўспамаглі будову басейна, і „Спартыўнаму таталізатару”, які таксама заўважальна падтрымаў інвестыцыю. Гайнаўскае павятовае староства перадало зямлю пад частку басейна, якая раней належала да Гайнаўскага белліцэя. У час урачыстасці моцна заўважальнымі былі менавіта вучні гэтай школы. Дзяўчаты са „Знічкі” ў беларускіх касцюмах і белліцэісты віталі ўсіх гасцей і дапамаглі адкрыць басейн, трымаючы ў час урачыстасці бел-чырвоную стужку. Перарэзалі яе маршалак Яраслаў Дважанскі, ваяводскі радны Мікола Яноўскі, гайнаўскі староста Уладзімір Пятрочук і бурмістр Анатоль Ахрыцюк. Маршалак Яраслаў Дважанскі моцна расхваліў гайнаўскую ініцыятыву і сказаў, што можна хадайнічаць аб фінансавую падтрымку іншых праектаў у рамках Рэгіянальнай аперацыйнай праграмы „Развіццё турыстычнай займальнасці рэгіёна”, адкуль і прыйшлі грошы на басейн. Падляшскі дэпутат Сейма ад Грамадзянскай платформы Роберт Тышкевіч даслаў ліст, у якім пахваліў бурмістра за яго руплівасць пры будове басейна.

Бурмістр Анатоль Ахрыцюк паінфармаваў, што першая тэхнічная дакументацыя крытага басейна была выканана яшчэ ў палове васьмідзесятых гадоў і хутка ўстарэла, бо не было сродкаў на так вялікую інвестыцыю. Цяперашняя будова Воднага парку была самай вялікай спартыўна-адпачынковай інвестыцыяй у гісторыі Гайнаўкі і таму гарадскія ўлады стараліся прыцягнуць як найбольш вонкавых сродкаў. Рэалізацыя гэтай задумы распачалася ў палове 2006 года, а будова аквапарку мела закончыцца ў 2008 годзе, але была спынена з-за нястачы сродкаў. Фінансаванне вялікай інвестыцыі распачалося з гарадскіх грошай і са сродкаў „Спартыўнага таталізатара”. У першым этапе будовы Воднага парку завершаны былі земляныя работы, а велізарны будынак, у якім пазней размясціўся ўвесь парк, быў прыкрыты. Тады інвестыцыя была спынена, бо ў 2007 і 2008 гадах было практычна спынена размеркаванне еўрасаюзных сродкаў, якімі мела далей фінансавацца будова парку. Толькі ў пачатку 2009 года Маршалкоўская ўправа прызначыла еўрасаюзныя сродкі з Рэгіянальнай аперацыйнай праграмы на далейшую будову басейна і, пасля перагавораў наконт коштаў інвестыцыі, прадпрыемства „Польбуд” з Бельска-Падляшскага распачало будаўнічыя работы, якія ўдалося завяршыць за няцэлы год. Уся інвестыцыя каштавала 26 мільёнаў 250 тысяч злотых. 8 мільёнаў 150 тысяч злотых еўрасаюзных сродкаў было прызначаных у рамках аперацыйнай праграмы, 1 мільён 400 тысяч злотых далажыў „Спартыўны таталізатар”, а 16 мільёнаў 700 тысяч злотых склалі сродкі гарадскога бюджэту і крэдыты, якія са згоды радных узялі гарадскія ўлады. Менавіта гэтыя мільёны крэдытаў выклікаюць эмоцыі ў часткі гайнавян, якія лічаць, што гэтыя грошы можна было выдаткаваць на больш патрэбныя жыхарам ініцыятывы. Аднак у час урачыстага адкрыцця басейна ніхто не разважаў у такі спосаб, а ўсе выступаючыя моцна хвалілі ініцыятыву гарадскіх улад.

Перад уваходам на басейнавыя пляцоўкі сабраныя маліліся разам са сваімі іерархамі — гайнаўскім епіскапам Міранам і драгічынскім епіскапам Антонім Дыдычам — ды шматлікімі святарамі. Епіскапы супольна асвяцілі Водны парк, затым адбылася прэзентацыя водных атракцыёнаў. Аквапарк будаваўся з выкарыстаннем даражэйшых тэхналогій і матэрыялаў. Цяпер гайнавяне будуць маглі карыстацца большым басейнам доўгім на 25 метраў. Меншы басейн прызначаны для дзетак і школьнай моладзі, якая будзе вучыцца ў ім плаваць. Будуць у ім таксама ладзіцца рэкрэацыйныя гульні. Наведвальнікам аквапарку будзе прапанавацца салярый, сухая саўна або саўна з парай. Гайнавяне пакарыстаюцца гідрамасажамі. Дзеля гульняў дзеткам збудавалі ў парку шар, што стварае хвалю і невялікую горку. Моладзі збудавалі даўжэзную на 125 метраў трубу-серпанцінку, у якой будзе з'язджальня з вадой, і сцяну для скалалажання. Дарослыя будуць маглі таксама заказаць сабе касметалагічныя паслугі з масажамі. У час спартыўных спаборніцтваў на глядзельных месцах будзе магло змясціцца ажно 214 асоб. У сярэдзіне аквапарку будзе кіёск турыстычнай інфармацыі, дзе можна будзе не толькі атрымаць патрэбныя звесткі, але таксама купіць пушчанскія сувеніры. Дырэкцыя парку прадбачвае таксама здаць у арэнду памяшканне пад буфет. У вялікім будынку размешчаны яшчэ канферэнц-зал і адміністрацыйныя памяшканні. Пасля афіцыйнага адкрыцця і асвячэння басейна ў ваду ўвайшлі белліцэісты і белгімназісты. Дзяўчаты пачалі гуляць на месцы, дзе пускаліся хвалі, а пазней на малым басейне, а хлопцы плавалі на вялікім басейне. У галоўным з думкай пра маладых будаваўся крыты басейн.

— У хуткім часе будзе наладжана сустрэча з бурмістрам і будзем разважаць пра ўмовы карыстання басейнам вучнямі на ўроках фізкультуры. За гэтыя заняткі не будуць плаціць школьнікі, толькі самаўрады, — заявіў дырэктар новазбудаванага парку Міраслаў Хіліманюк. — Мы хочам, каб нашым паркам карысталася як найбольш людзей і каб яны былі задаволены нашымі паслугамі. Спадзяемся, што многія дадатковыя атракцыёны прыцягнуць да нас таксама ахвотных навучыцца плаваць. Будзем таксама прапанаваць нашы паслугі турыстам, якія прыедуць у Белавежскую пушчу.

З атракцыёнамі басейна ў час урачыстасці знаёміліся шматлікія прадстаўнікі самаўрадаў, розных устаноў і прадпрымальнікі. Не прыбылі на мерапрыемства парламентарыі нашага ваяводства, бо прымалі якраз удзел у пасяджэнні Сейма. Сабраныя даведаліся, што ў аквапарку былі прыняты на працу 26 чалавек, але іх лік у першых месяцах дзейнасці парку можа павялічыцца. З 18 снежня на басейн пачалі прыходзіць звычайныя гайнавяне.

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Ева з Чыжоў ад „прапашчых” спраў

Еву і Яўгена Тамашукоў сустракаем у Цеханоўцы, на падвядзенні ваяводскага конкурсу на найлепш захаваны помнік вясковага драўлянага будаўніцтва ў вялікай групе прадстаўнікоў пераможнай Чыжоўскай гміны. Іхняя хата ў Чыжах — з нумарам 155, здабыла другое месца на ўсё ваяводства.

— Жыве там цяпер пастаянна мая свякруха, Надзея, — кажа Ева. — І гэтая ўзнагарода — гэта яе заслуга. А пазнаёміліся мы з Яўгенам у Чыжах, на адным фэсце. Я, беластачанка, прыехала да сваіх знаёмых, спадарства Паплаўскіх, і „заіскрылася” паміж мною і чыжоўскім хлопцам. І працягваецца гэта да сёння! Генік працуе ў фабрыцы дываноў, я — юрыст. Маем двух сыноў. У Чыжах поўнасцю гаспадарыць мама, аўдавелая два гады таму, хоць хатка запісана ўжо на нас. Вядома, памагаем маме, якой ужо 79 гадоў. Не хоча мама зімаваць у Беластоку. Такія людзі як наша мама Надзея трымаюць Чыжы! Такой вёскі не знойдзеш са свечкай ва ўсёй Польшчы — чыстай, прыгожай, дагледжанай, з прыгожымі, працавітымі нашымі людзьмі! Гаспадарамі.

Ева цяпер з’яўляецца кансультантам медычна-юрыдычнай канцылярыі, якая займаецца дапамогай асобам пацярпелым у нешчаслівых выпадках.

— Дапамаглі мы ўжо вельмі шмат асобам, якія меркавалі, што нічога ім ужо не ўдасца здабыць на кампенсацыю. Ды вось была выплачана кампенсацыя паўтара мільёна злотых і пенсія ў некалькі тысяч злотых маладой асобе, якая была пацярпела ў нешчаслівым выпадку ў вёсцы. Будзе яна да канца жыцця патрабаваць дапамогі іншых асоб. Праўда, грошы аб усім не вырашаюць, але гэтую асобу кампенсацыя забяспечыць да канца жыцця, — на рэабілітацыю, на адпаведную дыету, на лякарствы. Мы змагаемся за немалыя грошы для нашых кліентаў. Мы для таго, каб памагчы, пакіраваць. Не здарылася яшчэ, каб хтосьці меў да нас нейкія прэтэнзіі. Перадаюць іншым інфармацыю да каго звярнуцца ў „прапашчых” справах. Людзі проста не ведаюць, ці варта шукаць свайго, ісці ў суд, колькі гэта будзе каштаваць, а без грошай баяцца чагосьці прабаваць. Людзі вельмі часта не арыентуюцца якія правы нам належацца. Мы пасля нешчаслівага выпадку часта разгубленыя, знерваваныя, у шоку. Бывае, даюць нам нейкія грашакі са страхавой фірмы, і на гэтым канчаецца. Вельмі шмат нешчаслівых выпадкаў у сялянскіх гаспадарках. Простая справа пры камунікацыйных страхоўках — ёсць абавязковая страхоўка *OC* (цывільная адказнасць). А ў вёсцы не ўсе сяляне гэтым карыстаюцца. А гэта вельмі важнае, бо ў гэтым плане можам дамагацца нейкіх кампенсацый. Нешчаслівыя выпадкі здараюцца пры звычайных гаспадарскіх працах, пры кансервацыі машын, часта старых, даўно нерамантаваных, бо ж вядома, якія сродкі маюць сяляне. Здараюцца пашкоджанні цела, турбуючыя пасля шмат часу. Вельмі шмат аварый у вёсцы пры ўдзеле дзяцей — яны ідуць у школу ці вяртаюцца з яе амаль зацямна. Вясной, летам і восенню дзеці церпяць пашкоджанні пры палявых працах. Мы збіраем усю дакументацыю, перасылаем нашым юрыстам, і яны дамагаюць такім асобам, каб атрымалі адпаведную кампенсацыю. А гэта немалыя сумы, якія б маглі кампенсаваць шкоды. Вядзем таксама інфармацыйныя акцыі — у школах, на прадпрыемствах, якіх кампенсацый за шкоды можа дамагацца пацярпелы. Ад жніўня 2008 года з’явіўся новы юрыдычны тытул: *zadośćuczynienie.* Раней гэтая кампенсацыя была паводле меркавання, — калі дадзеная страхавая фірма лічыла, што кампенсацыя належыцца або не, дык плаціла або не плаціла. Цяпер гэта абавязковае. Кожная страхавая фірма забавязана выплаціць такую кампенсацыю ўсім пацярпелым. Людзі, аднак, разгубленыя, даюцца лёгка абысціся, не пра ўсё ведаюць. Не ведаюць таксама хто ім паможа і колькі будзе гэта каштаваць. Калі звернецца да нас, не будзе несці ніякіх коштаў вядзення гэтай справы. Толькі пасля таго, як атрымае кампенсацыю, выплаціць нам ганарар, які раней удакладняем у дамове з ім. За такое сельскагаспадарчае *OC,* у выніку нешчаслівых выпадкаў, калі пацярпелымі з’яўляецца нават некалькі асоб у гаспадарцы, у сям’і, — можам даходзіць да паўтара мільёна еўра. Міла ўбачыць усмешку задавальнення на твары асобы, раней разгубленай у сваёй безнадзейнасці, калі мы зможам памагчы.

Калі падпісваем страхоўку, дык там сцісла акрэслена, на што можа разлічваць пацярпелы ў выпадку, скажам, калі паламаўся. А за тое, што мы цярпелі боль, што другая асоба мусіла намі апекавацца нейкі час, што знішчыліся нейкія прылады і рэчы, за тое, што мы не маглі працаваць (а ўспамога за час лекавання намнога меншая чым заробак; а сяляне таксама працуюць не толькі на гаспадарцы)? Кампенсацыя ідзе перш за ўсё з *OC* таго, што ўчыніў шкоду, а таксама з *OC* селяніна. І тут шкодная сама несвядомасць селяніна: „Нашто плаціць тую страхоўку!?” А гэта невялікія грошы на год, а ніколі невядома, што можа здарыцца. Таксама з асобамі, якія будуць пацярпелыя ў гаспадарцы селяніна. І яны могуць даходзіць звароту коштаў лячэння з *OC* таго селяніна. Мы інфармуем аб усім, маем дзесяць аддзелаў ва ўсёй краіне. Працуе ў нас штаб людзей — лекары судовай медыцыны, юрысты, якія займаюцца гэтым прафесійна. Важнае, што не бярэм ніякіх аплат наперад, авансам, каб пачаць нейкую справу. Мы нясем усе кошты аж да канца — пазітыўнага завяршэння справы.

Гайнаўка

Куцця ў невідучых

Павятовае праўленне Польскага саюза невідучых (ПСН) у Гайнаўцы пад кіраўніцтвам старшыні Януша Пуха арганізавала Куццю для невідучых і тых, якія слаба бачаць. Мерапрыемства наладзілі 12 снежня мінулага года ў Гайнаўскім доме культуры. Апрача членаў ПСН удзельнічалі ў ім запрошаныя госці, м.інш. намеснік старосты Гайнаўскага павета Юрый Сірак, кіраўнік Павятовага цэнтра дапамогі сям’і ў Гайнаўцы Павел Шыманюк, дырэктарка Бюро Акруговага праўлення ПСН у Беластоку Агнешка Шустка, ксёндз Юзаф Паскробка і айцец Ян Кулік.

Найперш адбылася мастацкая частка. З прыгожай калядкай выступіла таленавітая невідучая салістка Юліта Кічкайла з Гайнаўкі. А затым з батлейкай і калядкамі — вучні з гайнаўскага Комплексу школ № 2. Цікава было ўсё гэта пабачыць і пачуць!

Пасля — ужо за сталом застаўленым ежай — былі зычанні радаснага і сямейнага святкавання Ражджаства Хрыстовага, супольная малітва „Ойча наш”. Сустрэча невідучых з Гайнаўшчыны пры ўпрыгожанай ёлачцы ды з ксяндзом і бацюшкам мае для гэтых першых вялікае значэнне. Маюць ад яе столькі прыемных уражанняў! Разам яны ствараюць вялікую сям’ю, абменьваюцца думкамі, падтрымліваюць на духу адзін аднаго, суцяшаюць. Хто як не яны разумеюць адзін аднаго! У іх супольныя праблемы. Яны павіншавалі адзін аднаго ад шчырага сэрца, пажадалі здароўя, шчасця ды задавальнення з жыцця ў Новым 2010 годзе.

Ян ЦЕЛУШЭЦКІ
намеснік старшыні Павятовага праўлення ПСН

Нараўчанская гміна

Донарам — пашана і ўдзячнасць

Кроў — сімвал жыцця. Пакуль яна ў венах — чалавек жыве, калі перастане пульсаваць — чалавек памірае. Ніякая фабрыка ў свеце не зможа вырабіць аднаго з найбольш неабходных лекаў — крыві для пераліванння.

Без донараў, якія аддаюць кроў для лячэбных мэт, не было б магчымым у шмат якіх выпадках ратаванне людскога жыцця. Донары заслугоўваюць пашану ўсёй грамадскасці. Яны бясплатна аддаюць сваю кроў з уласнага пачуцця грамадскага абавязку.

8 снежня мінулага года падчас сесіі Гміннай рады ў Нараўцы заслужаныя пачэсныя донары з Нараўчанскай гміны Адам Васільчык, Шыман Яцкевіч, Рыгор Ставіцкі і Тамаш Савіцкі з Нараўкі, Павел Каліноўскі з Заблотчыны, Іаланта Беразавец са Стачка, Караліна Савіцкая з Барнацкага Моста і Ян Харкевіч з Лешукоў атрымалі дыпломы і рэчавыя ўзнагароды. Уручылі іх войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч і старшыня Гміннай рады Андрэй Мядзведзь.

(яц)

Новае Ляўкова

Што цешыць раднага

16, 17 і 18 снежня 2009 г. на ўсёй тэрыторыі Нараўчанскай гміны снег і мароз. Як вядома, снежань гэта кліматычны першы месяц зімы. Так яна і завітала да нас.

У Новым Ляўкове і Старым Ляўкове зараз новыя тратуары. Радны Новага Ляўкова год таму мабілізаваў аднасяльчан, каб замяталі снег з ходнікаў пасля ападкаў. Найбольш актыўным уручаў... бярозавыя венікі.

18 снежня 2009 г. ганаровы венік заслужана атрымала Вольга Максімюк. Смяшыла гэта і радавала. Ужо вядома, што венікі атрымаюць і іншыя жыхары Ляўкова. Няхай толькі пастараюцца.

На працягу трох дзён у Ляўкове намяло высокія гурбы снегу. Радны сам згарнуў снег з тратуара на вуліцы насупраць свайго дома. Зараз потым найбліжэйшая суседка, а затым другая. І пачаўся такі рух! 18 снежня згарнулі снег ад тратуара Сяргея Семаковіча да Аляксандра Максімюка ўключна. Ну, з некаторымі выключэннямі, бо тыя вяскоўцы выехалі.

Дзейсны падыход да справы цешыць раднага. Ён далей будзе рабіць усё магчымае, каб аднасяльчанам выгадней і лепш жылося. А крыху зрабіў. І вёска наколькі папрыгажэла.

У Ляўкове людзі старэюць і шмат іх тут, але не паддаюцца. А жывуць тут людзі ветлівыя да ўсіх, сардэчныя. **(яц)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Чарговая сустрэча Нарва — Гарадок

Сустрэчы паміж гімназістамі ў Нарве і Гарадку ўвайшлі ў школьны каляндар. Штогод у лістападзе праходзяць сяброўскія спатканні на мерапрыемстве „У нас так — як у вас?"

Дзень, у якім сабраліся вучні, бацькі і настаўнікі, выпаў цёплы. Быў чацвер, 12 лістапада 2009 г. Хуценька даехалі мы на гарадоцкае свята. Прывіталі нас вельмі цёпла, як заўсёды, спадарыні Анна Грыцук — дырэктарка гімназіі, Эля Раманчук — настаўніца беларускай мовы, вучні і бацькі. А тут чакала нас яшчэ многа, многа атракцыёнаў!

Гімназісты з Гарадка паказаліся ў п'есе „Пінская шляхта". Маладыя акцёры заваражылі нас, гледачоў, сваім майстэрствам. Сярод публікі чуліся весялосць і смех. Клімат пінчукоў вельмі ўдала, натуральна замацоўвала афармленне сцэны. Прыйшла чарга і на выступленне нарваўскага „Кабарэ". Многа захаплення выклікала жартоўная сцэнка „Дылемы Зэнка і Юзка" ў выкананні Ані Келбашэўскай, Юліты Клімук і Юліты Кананюк.

Пасля мастацкіх выступленняў вучні ўзаемна абдорваліся падарункамі ды запрасілі нас на пачастунак. Трэба сказаць, што вучні, бацькі і настаўнікі моцна пастараліся! Потым пачалася школьная дыскатэка. Можна было добра патанцаваць, пазнаёміцца з новымі сябрамі.

І ў гэты раз не падвёў спадар Пётр Касацкі. Ён як бацька сваіх дачок быў на кожнай сустрэчы ў Гарадку ці Нарве, пачаўшы ад пачатковай школы. Сёння яго дзеці ўжо закончылі вучобу ў гімназіі, а ён — усё ж з намі!

Час хуценька ішоў і прыйшлося з гасцямі развітацца.

Яшчэ раз дзякуем спадарыні дырэктар, настаўнікам, бацькам, гімназістам за цёплы прыём і цудоўную атмасферу ў час нашай пабыўкі. Чакаем Вас у Нарве, ужо ў 2010 годзе, у лістападаўскі вечар.

Ніна АБРАМЮК

Артур Вольскі

Нарадзіўся Божы Сын

Промень зоркі
з неба ліўся
ў цішыню начных далін.
Нарадзіўся,
нарадзіўся,
нарадзіўся
Божы сын!

Ён грахі людзей
адкінуў
у той самы цяжкі час,
калі гінуў,
калі гінуў
на Галгофе
дзеля нас.

Але смерць
над ім не ўладна.
Ён ўзнёсся, уваскрос.
І спяваем
мы суладна;
— Наш Гасподзь —
— Ісус Хрыстос!

Промень зоркі
запаліўся
самай радаснай з навін:
— Нарадзіўся,
нарадзіўся,
нарадзіўся
Божы сын!

Войшкі

Чарговай прынарваўскай вёскай, якую наведваем у нашым цыкле, з'яўляюцца Войшкі. Вёска характэрная перш за ўсё непаўторнай драўлянай архітэктурай. Праязджаючы праз Войшкі, зможам пабачыць упрыгожанні хат, акон, выкананыя таленавітымі падляшскімі майстрамі.

Але Войшкі гэта таксама гісторыя. Першапачаткова вёска знаходзілася ў іншым месцы, непасрэдна ля ракі Нарвы. Сённяшняе месцазнаходжанне Войшак — вынік XVI-вечнай валочнай памеры.

На працягу стагоддзяў у Войшках існавалі млыны і бровар. Цікавым аб'ектам з'яўляецца царква св. Міхала, якой першая алтарная частка пабудавана была ў 1865 годзе.

Войшкі гэта перш за ўсё драўляная архітэктура і арнаментоўка хат. У падляшскім стылі ўпрыгожвання дамоў пераважае геаметрычна-раслінная арнаментыка, радзей сустракаюцца заамарфічныя матывы. Тым не менш, тыповай на гэтым абшары з'яўляецца выява двух птушак на надаконніках.

Росквіт падляшскага стылю аздаблення выпаў на дваццатыя гады мінулага стагоддзя і доўжыўся да шасцідзесятых. Дамы, якія былі пабудаваны пазней, толькі спарадычна аздабляліся дэкаратыўнымі элементамі ў выглядзе карунак. Рамонты, праведзеныя цягам апошніх дваццаці гадоў, вельмі часта вялі да знішчэння гэтых аздоб. Але, нягледзячы на тое, што такога кшталту сталярнае рамяство занікла, дагэтуль можна адшукаць мясцовасці, дзе большасць будынкаў мае аздобы. Адной з такіх мясцовасцей з'яўляюцца якраз Войшкі.

Важнае, што жыхары Войшак клапоцяцца аб выглядзе сваіх хат і, рамантуючы іх, аднаўляюць таксама аздабленні.

Міхась СЦЕПАНЮК

Польска-беларуская крыжаванка № 1

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 49:

Язык, жупан, увага, павага, лідар, акт, нырка, ар, сталіца. Жылка, кіт, пуп, авал, навінкі, гады, змагар, арка, кот, ара.

Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі Ася Тарасюк, Наталля Тарасюк, Івона Анішчук з Дубін, Рафал Вакулюк з Арэшкава, Кацярына Дзержаноўская, Магда Магрук, Эва Аярчук, Віялета Дработка з Бельска-Падляшскага. Віншуем!



Галерэя Зоркі

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

1. Імя і прозвішча: Кацярына Грыгарук

2. Твой любімы прадмет: беларуская мова.

3. У жыцці хачу стаць: настаўніцай беларускай мовы.

4. У сяброў цаню: шчырасць.

5. Не люблю: фізікі.

6. Па-беларуску размаўляю: у хаце і на ўроках беларускай мовы, ужо дзевяць гадоў.

7. Кніжка, якая мяне захапіла: я вельмі люблю кніжкі Васіля Быкава.

8. Падабаецца мне музыка: беларуская і руская.

9. Люблю размаўляць: з настаўнікам беларускай мовы спадаром Янкам Карчэўскім, з сябрамі, з сям'ёй.

10. У „Зорцы" падабаецца мне: крыжаванка.

11. Чаму: таму што магу праверыць і папоўніць свой моўны слоўнік!

Музыка з кайфам

„ILO&friends" — моц у сяброўстве!

Пра сябе наогул нельга зашмат пісаць, але, здаецца мне, што пра гурт, з якім здараецца мне выступаць, варта распавесці, асабліва таму, што ён — адзін з нешматлікіх на Падляшшы, які трымаецца беларускай мовы. „Беларускай мовы — трэба", — спявае гурт „RIMA"! Згадваю гэты гурт не без прычыны, бо якраз дзякуючы майму сяброўству з гарадоцкімі музыкамі існуе „ILO&friends".

У траўні гэтага года споўніцца нам першых пяць гадоў, якія адсвяткуем з дапамогай новага, другога альбома (прынамсі моцна ў тое верым). Першыя гады нашай працы гэта час сапраўднай трансфармацыі: ад спакойнай акустыкі да кранальных, прасторных гукаў электрычнай гітары. Але не было б нас, каб не Мажэна Русачык, цяпер навуковец і незвычайна плённая кампазітарка, якая запісвае ўвесь час новыя праекты. Праўда, не з намі, але гэта якраз яна прыдумала, каб вярнуць да жыцця музыку гайнаўскага гурту „Гоман" (пра які ўжо я калісь тут распавядала). Такім чынам у траўні 2005 года супольна з Мажэнай Русачык і Андрэем Гжэсем, бубначом гурту „RIMA", упершыню выступілі мы на сустрэчы, прысвечанай памяці Тамары Саланевіч. Пасля дзеялася ўжо толькі больш і больш. Пачалі з выступу на „Бардаўскай восені". У пэўны момант на месца Мажэны прыйшоў Марцін Кахановіч, таксама „рімавец", з якім пачалі інтэнсіўна прэзентавацца ў Польшчы — у Варшаве, Кракаве, Торуні, Беластоку і іншых, у асноўным падляшскіх, гарадках. У такім складзе ў 2007 годзе запісалі мы свой першы альбом „Па дарозе". Зусім не так даўно далучыўся да нас і другі Андрэй, Паплаўскі, „рімаўскі голас", які ў „фрэндсах" іграе на бас-гітары. Так пачалі мы складаць новую якасць нашай музыкі, з якой у снежні ўвайшлі ў студыю, каб рыхтаваць музыку да другога альбома. У мінулым годзе здарылася нам яшчэ адна цікавая падзея. Да музыкі „ILO&friends" танцавальны калектыў з беластоцкай студыі „DanceOffnia" падрыхтаваў харэаграфію. У 2010 год увайшлі мы з новым, тэатральным вопытам. Вялікае дзякуй усім, якія падтрымліваюць нас і хочуць слухаць музыку, як яе называем, беластоцка-гарадоцка-гайнаўскай фармацыі сяброў.

i_basovka@o2.pl

Хачу быць настаўніцай роднай мовы!

З Кацярынай **ГРЫГАРУК**, *лаўрэаткай Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы, гутарыць Ганна* **КАНДРАЦЮК**

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

— Кася, у апытальніку для Галерэі „Зоркі" Ты напісала, што хочаш у жыцці працаваць настаўніцай беларускай мовы?

— Я многа думаю пра беларускую мову. І ў гэтым я абавязана сваім настаўнікам, яны адкрылі мяне на прыгожасць беларускага слова, культуры.

— Зараз Ты вучаніца першага класа белліцэя. Але Ты сказала, што беларускую мову вывучаеш ужо дзевяты год?

— Так, родную мову я пачала вывучаць у другім класе пачатковай школы. Вялікі ўплыў на мяне аказала настаўніца Людміла Грыгарук. Яна прывіла мне захапленне і цікавасць да ўсяго роднага...

— Што Табе найбольш запамяталася з атмасферы гэтага часу?

— Мой удзел у прадметным конкурсе. Я двойчы была лаўрэаткай па беларускай мове і, зразумела, многа чытала літаратуры.

— А каторы ўжо раз прыступаеш да літаратурнага конкурсу?

— Першы...

— Як гэта атрымалася?

— Аднойчы я прынесла сшытак з вершамі і паказала спадару Янку Карчэўскаму, майму настаўніку беларускай мовы. Ён сказаў пра конкурс, праверыў мае творы і выслаў іх на конкурс...

— Цікава, можна сказаць, што гэта ваш супольны поспех...

— Так можна сказаць. А зараз я таксама рыхтуюся да прадметнага конкурсу па беларускай мове.

— Жывеш у Гайнаўцы. Мне цікава ці Ты размаўляеш з сябрамі па-беларуску, напрыклад, пасля ўрокаў?

— Мне сорамна, але такога ў нас няма. А павінна, я ж вучаніца беларускага ліцэя.

— А ў сям'і размаўляеце па-свойму?

— Бывае па-рознаму. Але калі мы ў гасцях у бабулі і дзеда ў Новым Ляўкове, то я заўсёды размаўляю па-беларуску.

— Мне цікава, ці свае вершы Ты адразу напісала па-беларуску?

— Не, спачатку я напісала іх па-польску. Пасля іх пераклала на беларускую мову.

— Дзеля конкурсу?

— Гэта складанае пытанне. Напэўна, гэта быў стымул...

— Якое значэнне мае для Цябе ўзнагарода ў літаратурным конкурсе?

— Зараз у мяне больш упэўненасці, каб запісваць свае думкі і пачуцці па-беларуску.

На здымку: Кася з мамай

Кацярына ГРЫГАРУК

Ключы

Ключы да майго сэрца знойдзеш
у глыбіні маёй душы
калі хочаш яго адкрыць.
Ды найперш пакажы, што я
для цябе важная.
Пакахай мяне з маімі заганамі
і каштоўнасцямі, пакажы, што я
адзіная ў цябе.

Ты

Чаму ты выбраў мяне?
Навошта мяне цалаваў?
Ці сапраўды я нешта значыла?
Чаму ты адышоў
у гэтую зорную ноч?
Ты пакінуў мяне, а я сохну далей,
бо ніколі ў жыцці я не сустрэла
такога, як ты.

...І вось апошнім часам Сяргей Целеш з Гданьска паказаў мне свой альбом, у якім знаходзіцца здымак з беларускіх настаўніцкіх курсаў у 1943 г. у Беластоку. У цэнтры на ім Хведар Ільяшэвіч, а на табурэце з правага боку, у акулярах, сядзіць Аляксей Кішкель. Можа хто распазнае яшчэ і іншых?...

Ці так мала звестак пра Аляксея Кішкеля?

Лена ГЛАГОЎСКАЯ

Апошнім часам Сяргей Чыгрын напісаў пра выкладчыка Клецкай беларускай гімназіі Аляксея Кішкеля („Ніва", № 48, 15.11.2009, с. 8), што быццам пра яго даволі мала звестак. Так складаецца, што ў 2007 г. я напісала артыкул пра Аляксея Кішкеля „Заўсёды размаўляў па-беларуску" ў беластоцкім штомесячніку „Czasopis" (№ 3, с. 36-37). Там таксама апублікавала яго „жыцёрыс", пісаны ім у Гаркавічах 22 жніўня 1925 г. Захоўваецца ён ў Літоўскім цэнтральным дзяржаўным архіве ў Вільні, у фондзе Клецкай беларускай гімназіі. Раней за мяне ўспомніў яго Апанас Цыхун з Гродна ў сваёй кнізе „Пройдзеныя шляхі-пуцявіны" (Гродна 2003, с. 94-95), на якую я спасылалася. Па маёй просьбе прафесар Генадзь Цыхун яшчэ больш распытаў бацьку пра Аляксея Кішкеля. Запісы гэтыя перадаў ён мне для выкарыстання.

Зацікаўленых адсылаю да свайго артыкула. Тут хацелася б толькі паправіць пэўныя недарэчнасці ці ўвесці пэўныя ўдакладненні да напісанага Сяргеем Чыгрыном. У артыкуле не хапае дакладнай даты нараджэння Аляксея Кішкеля. Паводле ім самім напісанай аўтабіяграфіі, нарадзіўся ён 12 сакавіка 1889 г. у Гаркавічах Адэльскай гміны Сакольскага павета. 120 гадоў таму назад, а не 110 — як піша Сяргей Чыгрын. У 1898 г. распачаў ён навуку ў народнай школе ў Бабіках Сакольскага павета. У 1906-1909 гг. вучыўся ў „высшым начальным вучылішчы", праўдападобна ў Саколцы. 10 сакавіка 1910 г. здаў экзамен на настаўніка народнай школы і з верасня пачаў працаваць у Хатовіжы на Магілёўшчыне. У кастрычніку 1913 г. паступіў у Настаўніцкі інстытут у Магілёве, які закончыў у 1916 г. Пасля быў прызваны ў армію, у якой прабыў да 1 траўня 1917 г. Са жніўня 1917 г. быў назначаны на пасаду настаўніка матэматыкі і геаграфіі вышэйшага начальнага вучылішча ў Магілёве. Адначасова выкладаў гігіену на настаўніцкіх курсах. Пасля рэформы школ у 1919 г. працаваў у школе II ступені, пакуль не выехаў у Польшчу ў жніўні 1921 г. Вярнуўшыся на бацькаўшчыну, спрабаваў атрымаць пасаду настаўніка ў польскай школе на Сакольшчыне, але яму ў гэтым было адмоўлена ў сувязі з дрэнным валоданнем польскай мовай. Тады вырашыў працаваць на гаспадарцы ў родных Гаркавічах. У 1925 г. падаў заяву на працу ў Клецкай беларускай гімназіі. Як вынікае з архіўных дакументаў, палескія асветныя ўлады ў Брэсце, якім падлягала гімназія, штогод ставілі яму закіды наконт яго настаўніцкай падрыхтоўкі. Тым не менш Аляксей Кішкель працаваў у Клецкай беларускай гімназіі з 1 верасня 1925 г. да 31 жніўня 1930 г. Вучыў у ёй беларускай мовы і матэматыкі. Як запісана ў архіўных дакументах, „выконваў абавязкі ўзгадоўцы клясы, бібліятэкара, ад кастрычніка 1928 да 31 студзеня 1930 г. быў кіраўніком вучнёўскага інтэрнату пры гімназіі".

У тым жа 1925/1926 школьным годзе апрача Аляксея Кішкеля ў Клецкай гімназіі вучылі: а. Рыгор Лукашэвіч (рэлігія), Рыгор Якубёнак (беларуская мова, гісторыя, матэматыка), Юлья Мушкатова (польская мова), Вячаслаў Арэнь (прырода, фізіка, хімія, рысункі), Еўдакія Энгель (нямецкая мова, руская мова), Мар'я Галкоўская (польская мова), Надзея Штэмберг, Ян Апанасевіч. Раней, у першым годзе існавання гімназіі, вучылі заміж траіх апошніх Ганна Малойла (беларуская мова, геаграфія, гісторыя, рысункі, каліграфія) і Кароль Захара (польская мова). Ад 1 лістапада 1924 г. дырэктарам быў Антон Якімовіч, які заадно вучыў геаграфіі і спеваў. Яму менавіта кураторыя Палескай школьнай акругі выдала ў 1924 г. ліцэнзію на вядзенне прыватнай гімназіі ў Клецку. Так прынамсі вынікае з архіўных дакументаў. Паводле іх, атрыманне ліцэнзіі на гімназію было адмоўлена Язэпу Шнаркевічу, які пасля з'ехаў у Вільню. Менавіта Язэпу, не Францу, як Шнаркевіча называе Сяргей Чыгрын. Антон Якімовіч прапанаваў на кіраўніка гімназіі Фабіяна Акінчыца, які з 1923 г. быў настаўнікам і кіраўніком школы ў Засуллі Стаўбцоўскага павета. Аднак яму ўлады адмовілі не толькі пасады кіраўніка, але і настаўніка латыні і геаграфіі ў Клецкай гімназіі.

З архіўных дакументаў вынікае, што з 1 верасня 1930 г. на месца Аляксея Кішкеля на працу ў гімназію быў прыняты яго зямляк Мікола Чарнецкі, які закончыў Пражскі ўніверсітэт.

У першым годзе навучання было 52 вучняў у пяці класах (I — 9, II — 12, III — 6, IV — 15, V — 10). Усе былі праваслаўнага веравызнання. Сярод іх было 13 дзяцей святароў (25%), 30 — сялян. У Віленскім архіве захаваліся прашэнні са здымкамі паступоўцаў. Сярод іх была і беластачанка 16-гадовая Зося Грыцук, якая паступіла ў Клецкую беларускую гімназію ў 1930 г. У Беластоку жыла яна па вуліцы Сандамерскай, 7. Цікава, як склаўся яе лёс.

За навуку ў гімназіі плацілася ў залежнасці ад класа — ад 100 зл. да 180 зл. Пры школе была бібліятэка. У дакументах захаваўся план дома А. Гдусовай па вуліцы I Татарскай, 19, які быў зняты пад гімназію ў 1926/1927 школьным годзе.

Дакументы датычныя гімназіі знаходзяцца таксама ў Нацыянальным архіве ў Мінску.

Вяртаючыся да нашага земляка Аляксея Кішкеля, хацелася б ведаць, які лёс яго здымкаў з калекцыі Апанаса Цыхуна. Трэба мець надзею, што захоўваюцца яны зараз у прафесара Генадзя Цыхуна. Маю ўражанне, што 2 верхнія здымкі ў „Ніве" ўзяты з кнігі Апанаса Цыхуна, а ніжні — з Энцыклапедыі гісторыі Беларусі. Хіба, што арыгіналы іх мае аўтар артыкула. Шкада, што яны аказаліся „бяздомнымі" ў „Ніве", без адпаведнай праведненцыі.

Цікава было б высветліць, калі ўсё ж такі памёр Аляксей Кішкель у 1964 г. і ці захавалася яго магіла ў Гродне, што мяне турбавала ўжо ў 2007 г. На жаль, Сяргей Чыгрын не даў адказу на гэтыя пытанні ў сваім артыкуле, які я ўзялася чытаць з вялікай цікаўнасцю і шмат чым у ім расчаравалася. Таму і вырашыла што-небудзь дакінуць у „Ніву" пра Аляксея Кішкеля, каб пабольшыць колькасць звестак пра яго. Каб не было іх мала. І вось апошнім часам Сяргей Целеш з Гданьска паказаў мне свой альбом, у якім знаходзіцца здымак з беларускіх настаўніцкіх курсаў у 1943 г. у Беластоку. У цэнтры на ім Хведар Ільяшэвіч, а на табурэце з правага боку, у акулярах, сядзіць Аляксей Кішкель. Можа хто распазнае яшчэ і іншых?

Як памянялася жыццё за 20 гадоў?

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Звычайна ў пачатку новага года ўспамінаем мінулае. Апошнім часам многа гаварылася пра змены ў краіне і нашым рэгіёне пасля палітычнай і гаспадарчай трансфармацыі. У 1989 годзе паявіліся ў нас многія новыя магчымасці, якімі паспяхова карыстаемся ў галіне культуры, адукацыі, даследавання гісторыі ці грамадскага жыцця. Зараз у Польшчы вяшчаюць беларускае тэлебачанне „Белсат" і беларускае радыё „Рацыя", раней паявіліся новыя беларускія часопісы, былі створаны беларускія арганізацыі, а праз нейкі час нават дзейнічала беларуская партыя. Мы, беларусы, так як іншыя грамадзяне Польшчы, маем непасрэднае ўздзеянне на выбар сваіх войтаў, бурмістраў і радных і такім чынам маем нейкае ўздзеянне на фарміраванне рэчаіснасці вакол нас. За 20 гадоў выдалі мы многа кніжак на беларускай мове, у гэтым ліку падручнікі і духоўную літаратуру. У Беластоку было сарганізаванае навучанне па-беларуску. Вялікую актыўнасць праявілі нашы беларускія гісторыкі, якія апублікавалі шмат артыкулаў і гістарычных кніжак.

Вялікі будынак белліцэя і белгімназіі, вялікая спартыўная зала і новаадчынены крыты басейн (на першым плане) — хіба найбольш заўважальныя і сабраныя ў адным месцы матэрыяльныя ініцыятывы, якія збудавалі беларусы і палякі ў Гайнаўцы на працягу апошніх 20 гадоў з выкарыстаннем дзяржаўных, еўрасаюзных і гарадскіх сродкаў. Ужо ў васьмідзесятых гадах паявіліся планы выканання гэтых будынкаў, але з-за нястачы сродкаў іх не зрэалізавалі пры народнай уладзе

Не адзін раз ужо заўважалася, што паявілася новая якасць жыцця свядомых беларусаў, якой не было пры народнай уладзе, але зараз наша бяда ў тым, што наймалодшае пакаленне вельмі хутка асімілюецца з польскім насельніцтвам, чаго не было раней.

Многія нашы людзі ў гарадах і вёсках часта ацэньваюць апошнія 20 гадоў праз прызму гаспадарчага развіцця краіны, Беласточчыны і свайго бліжэйшага рэгіёна або іх заняпаду, а перад усім спазіраючы на ўмовы, у якіх прыйшлося ім працаваць і зарабляць грошы на ўтрыманне сям'і. Велічыня зарплаты і пакупная сіла грошай, якія зарабляем, часта прыкрываюць нам іншыя вартасці, магчымасці і козыры, якія паявіліся ў нашым нацыянальным і духоўным жыцці пасля 1989 года. Напрыклад, перад праваслаўнымі вернікамі таксама адкрыліся многія новыя магчымасці, якіх не было яшчэ ў васьмідзесятых гадах.

Рознімся наконт ацэнкі гаспадарчых перамен

Якраз у канцы снежня 2009 года выпала таксама 20 гадавіна рэформаў званых „планам Бальцаровіча", ад прозвішча тадышняга міністра фінансаў, эканаміста Лешка Бальцаровіча. Зараз у масмедыях у асноўным станоўча ацэньваюцца запачаткаваныя ім вялікія гаспадарчыя перамены. Аднак у адносінах да самога „плана Бальцаровіча" паяўляецца многа галасоў крытыкі. Напрыклад, экс-міністр фінансаў Гжэгаж Калодка гаворыць, што калі б не Бальцаровічава шокатэрапія і астуджэнне гаспадаркі ў канцы дзевяностых гадоў, то зараз сярэдняя зарплата, лічаная з падаткамі, не складала б 3,4 тысячы злотых, а 5 тысяч злотых. Гаворыць ён таксама, што калі б у Польшчы спачатку памалу праводзіліся рэформы, без працы не заставаліся б 3 мільёны людзей, а і гаспадарка была б мацнейшай (перад увядзеннем рэформаў Бальцаровіча прадбачвалася, што выклікаюць яны беспрацоўе размерам да 400 тысяч людзей). Аднак прыхільнікі „плана Бальцаровіча" гавораць, што не ўдалося поўнасцю рэалізаваць вызначаных у ім рэформаў, бо мала было прыватнага капіталу, які мог бы прымаць удзел у прыватызацыі дзяржаўных прадпрыемстваў, каб пабольшаць іх рэнтабельнасць. Многім нашым сялянам і рабочым рэформы Бальцаровіча атаясамліваюцца з масавым абанкручваннем пэгеэраў, калгасаў, з дарагой сельгастэхнікай і сродкамі для сельскагаспадарчай прадукцыі, з невялікімі даходамі і вялікім беспрацоўем.

— Калі Бальцаровіч увёў свае рэформы, усё паявілася ў магазінах, але ў нас не было грошай, каб тое купляць, — успаміналі вясковыя суразмоўцы.

У першых гадах пасля трансфармацыі частка нежанатых выхадцаў з вёсак, якія страцілі працу ў гарадах, сталі вяртацца да бацькоў, каб пры іх пратрываць гаспадарчую нестабільнасць. Многія маладыя сямействы ў гэтым часе таксама прыязджалі да вясковых бацькоў, каб успамаглі іх прадуктамі харчавання і грашамі, калі тыя былі ўжо на пенсіі і маглі сабраць нейкую капейку.

Аднак зараз рэформы 20-гадовай даўнасці не ацэньваюцца на падставе таго, што было спачатку або ў першым дзесяцігоддзі, але на аснове паслядоўнасцей гаспадарчай трансфармацыі. Калі б параўнаць сярэдні стандарт жыцця з васьмідзесятых гадоў і сённяшні, то заўважым цяпер яго павышэнне. Зараз за заробленыя грошы можна больш купіць электронікі, бытавой тэхнікі, а нават сабраць больш грошай на куплю аўтамабіля. Справа падобна маецца з большай часткай прамтавараў і з прадуктамі харчавання. Аднак асноўнай цяжкасцю, з якой зараз сустракаюцца ў пачатку сваёй прафесійнай работы маладыя людзі, а перад усім маладыя сямействы, з'яўляюцца вельмі вялікія цэны дамоў і кватэр у блоках. Нават вельмі падаражалі дамы ў сёлах і сталі маладаступнымі маладым. Многа людзей, асабліва малодшых, вымушана жыць у знятых кватэрах і многа грошай плаціць іх уласнікам. Вельмі дарагімі сталі таксама штодзённыя выдаткі на ўтрыманне сям'і, а таксама вышэйшая адукацыя, калі, маючы на ўвазе пакупную сілу зарплат, зраўняць сённяшнія расходы з тымі 20-гадовай даўнасці. Раней рабіў я аналізы наконт магчымасцей утрымлівання сямействаў з сельскіх гаспадарак і, падводзячы іх вынікі, можна сказаць, што, сёння гаспадарачы на тых самых гектарах, што працавалі бацькі, і гадуючы падобную колькасць жывёлы, як у васьмідзесятых гадах, цяжка выжыць і пры гэтым паслаць сваіх дзяцей у вышэйшыя школы. Тыя маладыя людзі, што рызыкнулі, узялі крэдыты і дакупілі зямлі або мацней разгарнулі гадоўлю, цяпер могуць яшчэ прадаўжаць сваю прадукцыю і толькі з гаспадарак утрымліваць свае сямействы.

Маладыя пакідаюць бацькаўшчыну

Калі пытаем саміх маладых людзей як успрымаюць новую рэчаіснасць, у асноўным яны аптымісты, а аб жыцці ў сямідзесятых і васьмідзесятых гадах ведаюць толькі з расказаў. Адукаваная моладзь часта гаворыць, што перад імі адкрываюцца вялікія магчымасці, бо могуць працаваць у розных месцах у Польшчы або выехаць у пошуках работы ў краіны Еўрасаюза. Аднак у выпадку беларусаў, пражываючых кампактна на Беласточчыне, трэба задумацца ці такія новыя магчымасці гэта не пагроза для захавання сваёй нацыянальнай свядомасці ў масавым маштабе. Хаця сёння ў Гайнаўцы ці Бельску-Падляшскім беспрацоўе большае чым было перад гаспадарчым крызісам, то людзі з гэтых гарадоў, якія працуюць фізічна, гавораць, што ўсе ахвотныя могуць знайсці там слабей платную фізічную работу (хаця гэта залежыць яшчэ ад выконваных прафесій). Аднак і гэтыя маладыя людзі выязджаюць за фізічнай работай у Вялікабрытанію, Германію і іншыя краіны Еўрасаюза. Горш справа маецца з маладымі беларусамі, якія, закончыўшы вышэйшыя школы, хацелі б вярнуцца ў свае гарады на пастаяннае жыхарства. Не ўсе з іх могуць так зрабіць, бо ў сваіх родных мясцовасцях не могуць знайсці працы. Нядаўна мужчына рашыўся прадаць новазбудаваны дом у Гайнаўцы, бо дачка, здабыўшы вышэйшую адукацыю, не знайшла тут работы і пераехала на пастаяннае жыхарства ў большы горад. За грошы ад продажу дома бацька хоча купіць кватэру ў гэтай большай мясцовасці. Хаця моладзі, якая закончыла вышэйшыя школы, лягчэй знайсці работу ў Беластоку, многа нашых маладых хлопцаў і дзяўчат не рашаецца жыць у ваяводскім горадзе і падаецца ў пошуках лепш платнай работы і пастаяннага жыхарства ў іншыя вялікія гарады Польшчы і ў больш развітыя краіны Еўрасаюза, што якраз можа і тармозіць гаспадарчае развіццё нашага рэгіёна.

Калі ў агульным глянуць на перамены, што адбыліся ў нашым бліжэйшым наваколлі за 20 апошніх гадоў, то станоўчых змен можна будзе знайсці больш, чым адмоўных. Напрыклад, новазбудаваныя дарогі і іншыя грамадскія інвестыцыі. Аднак хіба слушна найбольш незадаволеная з новай рэчаіснасці наша вёска, бо сялянам, якія найчасцей не інвеставалі ў свае гаспадаркі з-за нястачы сродкаў, цяжка будзе паспець за сельскагаспадарчым развіццём. Хаця вяскоўцы цяпер яшчэ выжываюць, карыстаючыся еўрасаюзнымі даплатамі і ў многіх выпадках пенсіямі старэйшых сямейнікаў, то даплаты ж у будучыні скончацца, а падаткі і складчыны на будучыя пенсіі будуць большаць. Зараз замала ўвагі адводзіцца людзям калекім, моцна хворым і іншым патрабуючым большай сацыяльнай дапамогі. Пры гэтым паяўляюцца выказванні больш ліберальна настаўленых палітыкаў, што трэба яшчэ абмежаваць сацыяльную дапамогу, каб можна было паменшаць падаткі і паскорыць гаспадарчае развіццё краіны. Нехта можа сказаць, што капіталізм, гэта лад для моцных людзей, але што ж у такім выпадку рабіць слабейшым? Нават у ЗША апошнім часам заўважылі, што трэба больш дапамагаць слабейшым і коштам замаруджання гаспадарчага развіцця краіны на многа гадоў уводзіцца там бясплатная масавая ахова здароўя.

Люстрацыйны абманшчык? (2)

У час другога разбору справы за люстрацыйную ману перад беластоцкім Акруговым судом афіцэр СБ, які „вёў" падляшскага дэпутата ад Лявіцы Яўгена Чыквіна, быццам бы сакрэтнага супрацоўніка, заявіў, што трактаваў яго як г.зв. службовы кантакт. Прыгадаем, што заяву ў суд унёс Беластоцкі аддзел Інстытута нацыянальнай памяці (ІНП). З дакументаў, якімі распараджаецца ІНП вынікае, што СБ цікавілася дэпутатам Чыквіным з 1977 года і да канца васьмідзесятых гадоў мінулага стагоддзя меў быць ён сексотам (сакрэтным супрацоўнікам) з псеўданімамі „Ізыдар" і „Вільгельм", чаму адмовіў у сапраўднасці заступнік грамадзянскіх правоў.

На другі разбор явіліся два функцыянеры Службы бяспекі (па адукацыі настаўнікі). Апрача вядучага афіцэра, 56-гадовага Аляксандра К., сваёй чаргі ў судовым калідоры чакалі 68-гадовы Збігнеў З., былы начальнік IV аддзела СБ, які займаўся духавенствам і рэлігійнымі арганізацыямі. Абодва яны не далі згоды на публікацыю ў СМІ сваіх выяў і прозвішчаў. Аляксандр К. меў кантакты з падляшскім дэпутатам, калі той быў у Беластоку старшынёй аддзела Хрысціянскага грамадскага згуртавання (ХГЗ).

— Паводле персанальнай папкі быў ён сексотам. Для мяне быў ён слабым сексотам. Я трактаваў яго як службовы кантакт. Найчасцей службовымі кантактамі былі асобы на відных пасадах, напрыклад, у прадпрыемствах, дырэктары, а ў ХГЗ старшыня, — гаварыў Аляксандр К.

Раней распавядаў ён, што „пераняў апеку" над ХГЗ у Беластоку і Яўгенам Чыквіным па загадзе свайго кіраўніцтва і ніякай фармальнай працэдуры пераняцця не было:

— Абяцаў, што будзе інфармаваць мне толькі аб тым, што афіцыйнае.

Пасля гэтай заявы ў час першай сустрэчы з пазнейшым дэпутатам Аляксандра К. быццам бы агарнулі сумненні:

— Трохі мяне збянтэжыла гэта, бо раней чуў, што быццам бы ён дзесьці зарэгістраваны ў якасці сакрэтнага супрацоўніка і меў я загад пераняць ХГЗ і Чыквіна як сексота. Аб тым, што з'яўляецца ён сексотам паінфармаваў мяне кіраўнік секцыі. Да гэтага часу ніякай дакументацыі аб ім я не бачыў, таму што працэдура пераняцця была вельмі хуткая. Я сказаў начальніку, што Чыквін як сексот выклікае мае сумненні, таму што з ягоных выказванняў я палічыў, што не паводзіць ён сябе як сакрэтны супрацоўнік. Начальнік сказаў, каб я гэтым не пераймаўся, бо ад ваяводскага аддзела ХГЗ няма істотных пагроз і каб я ўтрымліваў з ім далейшы кантакт.

Старшыня судзейскага складу Беата Аліферук распытвала, ці Яўгену Чыквіну былі даручаны нейкія канкрэтныя задачы. Аляксандр К. расказваў:

— Я яму задач не ставіў. Начальнік не гаварыў мне аб якім-небудзь заданні для Чыквіна, толькі сказаў мне, што буду мець дачыненне з вельмі цяжкім мужыком. Я палічыў, што гэта не сакрэтны супрацоўнік, толькі службовы кантакт.

Пасля тлумачыў:

— З Чыквіным я прабаваў сустракацца праз нейкі час. Удавалася мне з ім сустрэцца пару раз у год. На пачатку я прыходзіў у сядзібу ХГЗ. Сустракаліся або на вуліцы, або ў маёй машыне. Чыквін хадайнічаў за новую сядзібу ХГЗ.

Адзначыў таксама:

— Калі я пераняў дакументацыю Чыквіна, меў ён псеўданім „Вільгельм". Я чуў, што раней меў ён псеўданім „Ізыдар" (...). Я намякаў кіраўніку, што Чыквін не выконвае катэгорыі сексота і трэба яго здаць у архіў. Кіраўнік сказаў, каб я з гэтым не спяшаўся, бо гэта чалавек на высокай пасадзе.

Пры нагодзе Аляксандр К. прызнаўся, што за год вёў каля дзесяцёх сексотаў:

— Галоўным чынам я займаўся духоўнымі, у адносінах да якіх працэдура была больш ліберальная. Калі духоўны пасля некалькіх сустрэч адабраў мае візіты, я падаваў заяву рэгістраваць яго як сексота і мой кіраўнік найчасцей гэта адабраў. У выпадку духоўных асоб не пісалі яны абавязацельстваў аб супрацоўніцтве. Я ніколі такіх абавязацельстваў ад іх не патрабаваў.

Вяртаючыся да быццам бы супрацоўніцтва Яўгена Чыквіна, Аляксандр К. сцвердзіў:

— Чыквін не падслухоўваўся, але мог падслухоўвацца аддзел ХГЗ і праваслаўная курыя. Быў таксама перагляд карэспандэнцыі ХГЗ і перагляд службовай карэспандэнцыі Чыквіна.

Пасля адыходу з СБ у канцы верасня 1989 г. (пачаў службу ў снежні 1979 г.) Аляксандр К. перадаў папку дэпутата Чыквіна свайму начальству. Суддзя пыталася, ці Аляксандр К. пасля адыходу са службы бачыўся з дэпутатам. Той расказаў аб адной сустрэчы — на пошце пры чыгуначным вакзале, калі Яўген Чыквін аблаяў яго пры прысутных, выкрыкваючы, якім правам зрабіў яго сакрэтным супрацоўнікам.

Дапытванне наступнага сведкі — начальніка Збігнева З. адтэрмінаванае на палову студзеня. У кулуарах суда ў размове з „Нівай" успомніў ён пра сочку праваслаўных асяроддзяў у васьмідзесятыя гады:

— Даходзіла да вельмі непрыемных інцыдэнтаў на Беласточчыне ў адносінах да праваслаўных. Мы мусілі віжаваць за гэтым асяроддзем, каб не дайшло да рэваншаў.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

PS. У папярэдняй справаздачы з працэсу дэпутата Чыквіна я памылкова напісаў, што старшыня ХГЗ не жыве. Тым часам карыстаецца ён добрым здароўем, што цешыць і мяне. За памылку прашу прабачэння.



Цяжка ўявіць сабе гісторыю без помнікаў, бо без іх гісторыі не бывае. І гэта незалежна ад таго ці гэта вялікае збудаванне кшталту егіпецкіх пірамід, ці невялікі драўляны ідал паганскіх часоў. Усе яны распавядаюць пра тое, чым жылі людзі, у што верылі, што сабе думалі і як асэнсоўвалі навакольнае асяроддзе.

Практычна ў кожнай краіне існуюць разнастайныя таварыствы, мэта якіх — захаванне помнікаў гісторыі і культуры таго ці іншага народа. Сярод такіх арганізацый пра наш народ у гэтым дачыненні рупіцца „Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры".

Увосень гэтага года ў інтэрнэце пачаў стала працаваць сайт гэтага таварыства. Месціцца ён па адрасе **http://pomniki.budzma.org.**

Першы погляд на вэб-старонку адразу наладжвае на нейкі сур'ёзны падыход пры далейшым азнаямленні. Старонка падзелена на дзве часткі. Прычым выйсці да іншых рубрык месцяцца не злева, як звычайна, а справа. Назва сайта, пададзеная ўверсе, аздоблена фотавыявай храма, знятага знізу ўверх.

Асноўнае месца на першай старонцы займаюць рознага кшталту паведамленні, што тычацца помнікаў і дзеянняў па іх ахове. Яны не падзелены тэматычна, ідуць, па ўсім відаць, проста па меры паступлення і размяшчэння. Тут распавядаецца і пра звароты таварыста да беларускіх улад, падаюцца аналітычныя артыкулы, навінныя паведамленні. Усё гэта ачольвае назва „Актуаліі".

Колькасць рубрык на сайце дастаткова вялікая. Некаторыя з іх размешчаны ўверсе выяўлення — пэўна тыя, якія распрацоўшчыкі палічылі найбольш важнымі. З гэтым можна пагадзіцца, звярнуўшы ўвагу на назвы старонак — „Заканадаўства", „Мерапрыемствы", „Рэгіёны", „Пра нас".

Да апошняй названай рубрыкі варта прыглядзецца больш уважліва, бо там ідзе своеасаблівая прэзентацыя таварыства аховы помнікаў. «Грамадскае аб'яднанне „Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры" — адна са старэйшых арганізацый Беларусі. Заснавана ў 1966 годзе. За гады існавання прайшла шлях ад дзяржаўна-грамадскай інспекцыі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і фонду, які фінансаваў рэстаўрацыю шматлікіх беларускіх помнікаў, у тым ліку Сафійскага сабора ў Полацку, Кальвінскіх збораў у Заслаўі і Смаргоні, да чыста грамадскага, цалкам незалежнага ад дзяржавы, аб'яднання», — так распавядаюць пра сябе аматары зберагання даўніны.

Адной з галоўных мэт дзеяння таварыства з'яўляецца „выяўленне і ўлік помнікаў гісторыі і культуры Беларусі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і за яе межамі, распаўсюджанне сярод насельніцтва ведаў аб помніках і фарміраванне на гэтай аснове нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа і павагі да культурнай спадчыны іншых народаў, да агульначалавечых культурных каштоўнасцей".

Сярод іншых рубрык, якія месцяцца збоку, варта адзначыць „Вайсковы пошук". Тут распавядаецца аб тым, што таварыства аказвае дапамогу ў пошуку хоць якіх звестак пра людзей, што не вярнуліся з франтоў апошняй вайны.

Разнастайныя міжнародныя дакументы, якія тычацца захавання спадчыны, месцяцца на старонцы „Метадалогія". Праўда, не ўсе яны перакладзены на беларускую мову.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

У чаканні алімпіяды

Галоўнымі чаканнямі новага спартовага года безумоўна стануць чарговыя белая алімпіяда і чэмпіянат свету па футболе. Больш актуальнай для беларускіх заўзятараў з'яўляецца зімовая алімпіяда, якая распачнецца ўжо 12 лютага ў канадскім Ванкуверы. Калі весці гутарку пра медалі, то без праблем можна прагназаваць далейшую экспансію кітайцаў, традыцыйныя прэтэнзіі Расіі, Нарвегіі, Нямеччыны, ЗША — тых краін, што звычайна змагаюцца за першынство ў агульным заліку. Асноўныя надзеі беларусаў — на фрыстайл і біятлон. У акрабатыцы на лыжах Беларусь мае ў гісторыі двух алімпійскіх прызёраў — Дзмітрыя Дашчынскага і Аляксея Грышына. Абодва і зараз у складзе каманды, але іх падрыхтоўка сур'ёзна абцяжарана траўмамі. Крыху нечакана ў лідары зборнай выбіўся Антон Кушнір, які цяпер узначальвае генеральную класіфікацыю Кубка свету. У абойме таксама Ала Цупер, Цімох Слівец, Дзмітрый Осіпаў, здольныя на подзвіг у адзін канкрэтны дзень. Вярнулася пасля двухгадовага перапынку на трамплін і Асоль Слівец. Што датычыць біятланістаў, то ў індывідуальных дысцыплінах здольная на сур'ёзны поспех Дар'я Домрачава. Адзначым удалы старт сезона і Надзеі Скардзіны. У жаночай эстафеце, калі беларускія дзяўчаты ўдала адстраляюць, яны маюць пэўныя шанцы на трэцяе месца на п'едэстале. У мужчын рэальнае заданне — прэтэндаваць на месца ў васьмёрцы ў эстафеце. Усё ж такі трапнай стральбы Сяргея Новікава і прагрэсу Яўгена Абраменкі малавата, каб думаць пра больш сур'ёзныя дасягненні.

Асобна будзе стаяць выступ беларускай хакейнай дружыны. Паўтарыць поспех гульняў у Солт-Лэйк-Сіці (4-е месца ў 2002 годзе) не проста цяжка, а нават маларэальна. У групе падначаленыя Міхаіла Захарава будуць змагацца са Швецыяй, Фінляндыяй і Нямеччынай. У такой сітуацыі ўжо выхад у чвэрцьфінал справядліва будзе ацэнены як геройства. У іншых зімовых дысцыплінах — лыжных, канькабежных гонках — беларускім прадстаўнікам адведзена роля статыстаў.

Безумоўна з нецярпеннем аматары футбола будуць чакаць чэмпіянату свету, які пройдзе з 11 чэрвеня па 11 ліпеня ў Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы. Наш жа інтарэс у лёсаванні адборавых груп да чарговага чэмпіянату Еўропы. Інтарэс падвойны, бо першынство 2012 года адбудзецца зусім блізка ад Беларусі — у Польшчы і Украіне. Жэрабя, якое размяркуе зборныя, будзе кінутае ў Варшаве 7 лютага. А ўвосень адборавы турнір завіруе напоўніцу. Цікава будзе сачыць і за выступам барысаўскага БАТЭ ў еўракубках — ці здолее каманда Анатоля Капскага і Віктара Ганчарэнкі зноў парадаваць сваіх прыхільнікаў?

Не будзе бракаваць і іншых спартовых падзей. Прыкладам, 5-7 сакавіка мужчынская тэнісная дружына Беларусі ўпершыню ў гісторыі згуляе з Італіяй у Кубку Дэвіса. Калі ўдасца перамагчы апенінцаў, у маі чакае выпрабаванне ўжо зборнай Нідэрландаў у спаборы за вяртанне ў плэй-оф і эліту. Ці прадоўжаць узыходжанне беларускія тэнісісткі, у першую чаргу Вікторыя Азаранка, якіх як звычайна чакае мноства міжнародных турніраў? У траўні аматары хакея будуць хвалявацца ўжо за выступ хакеістаў на чэмпіянаце свету. Ён пройдзе ў Нямеччыне, дзе беларусы на першым этапе сустрэнуцца з Расіяй, Славаччынай і Казахстанам.

З падзей наўкола можна чакаць нарэшце завяршэння эпапеі з допінгавым скандалам айчынных кідальнікаў молата — Вадзіма Дзевятоўскага і Івана Ціхана, змен у асобных федэрацыях, а магчыма і гучных спраў. Новы сезон вельмі хутка пачне адлік.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

1 ☞ працяг

З'езд-опера

выя сродкі ад пачатку 2006 года (каля 400 тысяч злотых) мы пераканаліся, што справа ідзе не на прытрымліванне законаў, а на знішчэнне БГКТ і ўсёй беларускай культуры. (...)

Асабліва балюча пераконваліся мы тады, калі БГКТ апынулася ў сапраўднай бядзе. Тады якраз, без увагі на лёс беларускай культуры, без увагі на мараль, некаторыя „малайцы" працягнулі руку на выпрацаваныя ўжо намі грошы. Другія правакатары і прадаўцы нацыянальных інтарэсаў, калі ўбачылі, што БГКТ яшчэ не памерла і разам з ТБК арганізуе галаканцэрт фестывалю „Беларуская песня-2008", пастанавілі сарганізаваць прымітыўную, дзікую палітычную правакацыю з мэтай знішчэння фестывалю. Калі правакацыя аказалася няўдачай, а да яе выканаўцаў аднесліся як да звычайных хуліганаў, тады галоўныя ініцыятары выступаюць да прэм'ер-міністра з абвінавачаннем арганізатараў з мэтай знішчэння фестывалю. „Гераічную" паставу за знішчэнне беларускай культуры выказваюць самыя прадстаўнічыя беларускія „патрыёты": Яўген Вапа ад імя Беларускага саюза, Алег Латышонак ад імя Беларускага гістарычнага таварыства, Радаслаў Дамброўскі ад імя БАСу.

У выключна цяжкі перыяд нашага існавання і нашай паралізаванай дзейнасці ГП праяўляла вялікую актыўнасць у напрамку нармалізацыі ў адносінах да польскіх улад і ў напрамку дапамогі з боку цэнтральных і рэгіянальных улад Рэспублікі Беларусь. (...)

Паводле рашэння Акруговага суда ў Беластоку ад 22 красавіка 2008 года Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы перададзены на ўласнасць гайнаўскаму таварыству „Музей і асяродак беларускай культуры". Пры нагодзе трэба прыпомніць, што БГКТ як ранейшы ўласнік не мела ніякай магчымасці ўплываць на арганізацыйна-праграмныя развязкі ў дзейнасці Музея, нават тады, калі рэальнай была магчымасць пастаяннай фінансавай і праграмнай дапамогі з боку Маршалкоўскай управы. Барацьба з мясцовым асяроддзем актывістаў была б абсурдам. Трэба таксама дадаць, што задоўжанасць БГКТ у Гарадской управе Гайнаўкі дасягнула квоты больш 100 тысяч злотых, а Музей пачаў выпрацоўваць дэфіцыт. (...)

Асобная праблема ў дзейнасці БГКТ і ТБК — гэта супрацоўніцтва са сродкамі масавай інфармацыі. Якасць супрацоўніцтва ў далейшым была вельмі дрэннай. Прычынай гэтаму з'яўляюцца адмоўныя адносіны журналістаў да БГКТ, да ТБК і да нашай дзейнасці. У сувязі з тым не паяўляюцца ў СМІ нармальныя бадай толькі інфармацыі аб мерапрыемствах, якія арганізуем — яны ў некалькі разоў больш скромныя чым аб мерапрыемствах іншых арганізатараў. Калі ўзяць пад увагу праявы радасці журналіста „Нівы", калі МУСіА ці камісар упраўляючы ваяводскай самаўправай адбіраюць беларускаму таварыству фінансавыя сродкі, то трэба бачыць у тым не толькі адмоўныя адносіны да БГКТ ці ТБК, але дзікую нянавісць да многіх тысяч беларусаў — удзельнікаў папулярных і любімых імі імпрэзаў. Людзі часта паўтараюць гэтую праўду, што беларускамоўныя СМІ прыносяць вялікую шкоду і крыўду асяроддзям беларусаў у Польшчы і што такой сітуацыі няма ў ніводнай іншай меншасці ў Польшчы. Чарговы раз беларускамоўныя журналісты даказваюць, што ваююць не за развіццё, але за знішчэнне нашай беларускай культуры. Такі спосаб выконвання прафесіі журналіста — гэта дзейнасць супраць дэмакратыі, супраць абавязку публічнай місіі, супраць прафесіяналізму і супраць маралі.

Насуперак усім перашкодам, цяжкасцям і знішчаючым сілам, актыўнасць ГП у згаданыя гады не знікла. Паколькі згода на заняпад беларускай культуры была б невыбачальным злачынствам, задачы ў галіне культуры мы пачалі рэалізаваць іншымі формамі і метадамі актыўнасці. (...) Можна з гонарам падкрэсліць, што знішчальныя сілы не былі ў стане паралізаваць беларускі аматарскі рух, які ўвесь час праяўляў сваю артыстычную актыўнасць, працаваў на рэпетыцыях, і часта выступаў на шматлікіх фестывалях, конкурсах, арганізаваных ТБК пры актыўнай ініцыятыве і непасрэднай дапамозе БГКТ. (...)

Непрадбачаныя цяжкасці і перашкоды мабілізуюць нас і ўвесь аматарскі рух да стойкасці і асаблівай актыўнасці каб не дазволіць на знішчэнне вопыту і дасягненняў некалькіх пакаленняў беларускіх патрыётаў. Шматлікія калектывы выказвалі гатоўнасць выступаць у любых умовах — без яды, без узнагарод, на свой кошт, каб толькі разам з арганізатарамі і публікай зберагчы бясцэнныя вартасці нашай народнай спадчыны, нашай любімай многімі тысячамі беларусаў нацыянальнай культуры. (...)

Воплескі беларускіх дыпламатаў

Трэба нам з вялікай радасцю і пакорнай удзячнасцю падкрэсліць заіснаванне ў Беластоку новай культурнай установы — Культурнага цэнтра Беларусі ў Польшчы. (...) На працягу ўсяго 2009 года аказваў ён бясцэнную арганізацыйную і фінансавую дапамогу нашаму таварыству ў рэалізацыі ўсіх важных культурных і навукова-асветніцкіх мерапрыемстваў. (...) З вялікай прыхільнасцю і неаднойчы з дапамогай адносіцца да нас таксама Міністэрства культуры РБ, так па справах пашыўкі касцюмаў, як і дафінансавання калектываў, якія прыязджаюць да нас з Рэспублікі Беларусь. Вялікай цэннасцю для нас, як арганізатараў, з'яўляецца выключная прыхільнасць гродзенскага Аблвыканкама ў адносінах да ўсіх праблем дзейнасці. (...)

Аматарскі рух з'яўляецца важным стымулам паглыблення моцных эмацыянальных сувязяў з нашай народнай спадчынай. Дзякуючы вялікаму заангажаванню многіх артыстаў-самадзейнікаў, іх бескарыснай самаадданай працы, дзякуючы інструктарам і арганізатарам аматарскага руху БГКТ можа рэалізаваць свой багаты план культурнай дзейнасці на карысць усіх беларускіх асяроддзяў у Польшчы. Усім удзельнікам беларускага аматарскага руху, інструктарам, арганізатарам, дырэктарам асяродкаў і дамоў культуры, усім спонсарам і спрыяльным самаўправам гмінным, гарадскім, павятовым і ваяводскай ГП БГКТ з нагоды з'езду выказвае шчырую падзяку. (...)

Навучанне беларускай мовы гэта сённяшні дзень і будучыня беларускай нацыянальнасці ў Польшчы. (...) Паколькі навучанне беларускай мовы ў поўнай залежнасці ад волі бацькоў, таму трэба ім нечым даказаць, што варта каб іх дзеці вучыліся беларускай мове, што гэта прыносіць карысць, дазваляе вылучыцца, атрымаць дыпломы і ўзнагароды. Адзінай дарогай каб гэта дасягнуць з'яўляецца ўдзел у беларускіх конкурсах. (...) Калі розныя „разумнікі" ставяць закіды адносна правядзення, арганізацыі, конкурсных камісій і чаго толькі, хочацца адказаць ім словамі Францішка Багушэвіча „калі хто падумае лепш і больш... таму чэсць вечная і ад жывых людзей, і ад бацькавых касцей". Самае дзіўнае гэта тое, што закіды ставяць нібыта „нашыя". Крыўдна, сумна і прыкра. Кусаюць, падкусваюць, а сваіх уласных дзяцей на конкурсы пасылаюць. Дзіця невінаватае і за бацькоў адказваць не павінна; і так гэта ёсць. Але нашто аплёўваць конкурс, у якім удзельнічае ўласнае дзіця? (...) Нягледзячы на даволі актыўную антыпрапаганду, нібыта беларускіх сродкаў масавай інфармацыі, удзельнічае ў конкурсах кожны год некалькі сот дзяцей. Конкурсаў некалькі, інфармацыя пра іх ад арганізатараў да дырэктараў і настаўнікаў даходзіць у час, узнагароды вартасныя, дыпломы прыгожыя і няма чаго больш хацець. (...)

(працяг будзе)

Адгаданка

1. 91,44 см., 2. літаратурнае прозвішча Сцяпана Пятэльскага, 3. дробна расцёртыя частачкі цвёрдага рэчыва, 4. валасяное покрыва жывёл, 5. царкоўнаслужыцелі і пеўчыя ў хрысціянскай царкве, 6. пастух авечак, 7. рака ў Вялікіх Луках, уліваецца ў возера Ільмень, 8. фігурная металічная накладка на абразах, якая пакідае адкрытымі толькі твар і рукі святога.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з літарай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — тыбецкая пагаворка.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 48 нумара

Дон, кіно, корд, ніць, рысь, соль, Тыбет, Эш.

Рашэнне: **Дрэнны конь есць столькі, што і добры.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лявону Федаруку** з Рыбал і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.



Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 250 egz.

Юрка ЛЯШЧЫНСКІ

Албанія — забытае месца Еўропы (1)

Бункры для аднае сям'і. Неўжываныя зарастаюць

„Большасць грамадзян гэтай дзяржавы не ведала, ці іх дзяржава надалей існуе, ці ўжо перастала існаваць. Сёння яе сталіца ў адным горадзе, але заўтра можа быць у іншым. Межы існавалі толькі на паперы". Вось так першыя гады незалежнасці дзяржавы апісваў Ісмаіл Кадарэ — найбольш вядомы ў свеце сучасны албанскі пісьменнік.

Ад часу апавяшчэння незалежнасці — 28 кастрычніка 1913 года да снежня 1914 года, калі ў выніку ваенных дзеянняў тэрыторыю Албаніі занялі суседзі, яе сталіца сапраўды перамяшчалася разам з тадышнім кіраўніцтвам краіны. Прычым існавалі нават два паралельныя асяродкі ўлады. Адзін, скажам, у Влёры, другі ў Дурэсе. Тырана сталіцай стала толькі ў 1921 годзе. Дзяржавай на працягу гэтага кароткага часу ўладарылі так айчынныя важакі, як і назначаныя „міжнароднай грамадскасцю". Былі гэта і аўстрыйскі князь, якога назначылі каралём, а які ніколі каралём не стаў, турэцкі пасол ці італьянскі генерал. Напярэдадні Версальскай мірнай канферэнцыі тэрыторыяй сённяшняй Албаніі правілі прадстаўнікі пяці дзяржаў. Аднак у выніку супярэчных інтарэсаў тагачасных магутных краін ды ўнутранага жадання Албанія стала суб'ектам міжнароднага права. Была і княствам, і каралеўствам, і рэспублікай, але ўжо была...

Тады менавіта на базе аднаго з дыялектаў была ўстаноўлена дзяржаўная мова і лацінскі алфавіт (датуль былі тры алфавіты — кірылічны, арабскі і лацінскі).

Наведаць Албанію не так лёгка

Наведаць Албанію не так ужо і лёгка. Прабаваў я на розныя спосабы і не адзін раз...

Непасрэдных авіярэйсаў з Польшчы няма. Можна лётаць з перасадкай, цераз Рым, Бухарэст, Любляну, Вену або Будапешт. Але гэта не будуць гэтак званыя „танныя паветраныя шляхі". Можна дабірацца на аўтобусах або цягніках — таксама з перасадкай, адной або і дзвюма. Даехаць у нейкі горад у суседняй краіне, скажам, Бар у Чарнагорыі, а там курс рэйсавым аўтобусам. Або ад поўдня ехаць з грэцкай Яніны. Можна паплыць паромам апошні адрэзак шляху: з Корфу ў Грэцыі у албанскую Саранту, або з Італіі: з Бары, Анконы і Трыеста ў албанскі Дурэс. Калі хтосьці мае настолькі адвагі і настойлівасці, дык можа ехаць у Албанію індывідуальна.

Я аднак выбраў арганізаваную экскурсію. Удалося за трэцім разам. Першы аб'язны варыянт экскурсіі „не толькі для арлоў" з-за малога зацікаўлення (трэба найменш 20 ахвотных, было 4) быў адкліканы. Другі варыянт — адпачынак у адным з курортаў „албанскай рыўеры" — таксама не атрымаўся. На месца трэба было б дабірацца двое сутак, і гэта без транзітных начлегаў. А яшчэ вярнуцца! Жах. Чатыры дні ў аўтобусе. Але быў і трэці варыянт. Проста, адпачываючы ў суседняй да Албаніі краіне, скажам, у Грэцыі або Чарнагорыі, купляецца на месцы экскурсію ў Албанію, аднаабо двухдзённую, і ў дарогу...

Аўтобус ехаў з Падгорыцы (сталіца Чарнагорыі) у Шкодэр — найбуйнейшы горад паўночнай Албаніі. Сябра побач, які на хвіліну прыснуў, калі разбудзіўся, убачыўшы за акном адну, другую, трэцюю мячэць, спытаўся: „Ці гэта Албанія?"

— Яшчэ не, — адказалі яму. Вежы мінарэтаў, якія міналі мы па дарозе, таксама характэрныя для памежных рэгіёнаў былой Югаславіі. І праўда, пражываюць тут албанцы, у Косаве, Чарнагорыі ці Македоніі, і на картах г.зв. Вялікай Албаніі ў яе межах, але толькі там.

Мяжу перасякаем у пагранпункце Гоні-Гоці на поўначы Шкодэрскага возера (адзін з трох дзяржаўных пераходаў на чарнагорска-албанскай мяжы). Даволі хутка, без лішніх кантроляў і без штампа ў пашпарце, але з фітасанітарнымі працэдурамі чамусьці.

— Вось і Албанія, — кажу сябру.

Дарога звузілася, быццам з Орлі ў Дубічы, а за акном іншыя краявіды. Мячэцяў быццам бы менш, зрэдку царква, затое касцёл побач касцёла і нейкія новыя ды нейкія дзіўныя, шарападобныя аб'екты. Гэта славутыя бункеры, якіх ва ўсёй Албаніі 750 тысяч, хаця мела быць роўна мільён. Бункеры самыя розныя — меншыя для адной сям'і, большыя для некалькіх. Расселены без ладу і складу, прынамсі цяпер такое ўражанне. Бліжэй да шашы, далей на панадворку, паміж жылымі дамамі, перагароджаныя плотам. Некаторыя памаляваныя.

Людзі ў аўтобусе рухаюцца, падымаюцца, робяць здымкі.

— Вось туды глянь, які вялікі! А вось тут ужо развалены...

— А вось гэты які каляровы! Толькі чаму ён перад парогам?

І сапраўды, калі ў васьмідзесятыя гады вярталі грамадзянам сканфіскаваныя ў час камунізму гаспадаркі, часта трапляліся і такія „сувеніры". На жаль, сёння як турыстычная цікавінка пакуль прыбытку не даюць, затое псуюць краявід. Сорак гадоў таму „таварыш камендант", як ветліва называлі І сакратара Албанскай партыі працы (камуністычнай) Энвера Ходжу, загадаў пабудаваць мільён бункераў. У выпадку вайны, а паводле прапаганды яна пагражала ў любую хвіліну, кожная сям'я мела схавацца ў найбліжэйшым і абараняцца ад агрэсара. Агрэсар так і не напаў на Албанію, затое пабудова мільёна такіх аб'ектаў (а кошт падобны да пабудовы кватэры ў блоку) не паспрыяла ўзроўню жыцця грамадства. З другога боку — такія псеўдабункеры мелі псіхалагічнае значэнне. Кшталтавалі мараль, напамінаючы грамадству пра заўсёды магчымую небяспеку. Ці то з боку заходніх імперыялістаў, ці ўсходніх (здрадніцкіх) неарэвізіяністаў.

Паўгадзіны пазней аўтобус даехаў у Шкодэр, амаль стотысячны найбуйнейшы горад на поўначы Албаніі. Гэта найбольш каталіцкая частка краіны. У самім горадзе каля паловы насельніцтва складаюць рымакатолікі. У сваю чаргу поўдзень краіны заселены ў асноўным праваслаўнымі, так албанцамі, як і грэкамі. Цэнтральная частка пераважна мусульманская, з якіх 20% гэта характэрная толькі для Албаніі мусульманская секта бекташы. Апошнія мусульмане — суніты.

(*працяг будзе*)

03.01 — 09.01

(22.03. — 20.04.) Знакамітыя перспектывы на працы. Калі шукаеш новай — паспяшыся, каб табе яе не падабралі. Будучыня тваёй пары — няпэўная, рашыся на адважны крок. Будзь крыху больш эластычным у поглядах.

(21.04. — 21.05.) У ложку не заснеш. Калі на працы разлічваеш на павышэнне — маеш шанцы, каб ажыццявіліся твае мары. Закахацца можаш, як кажуць, смяртэльна. Хоць першая палова студзеня ў кампанейскім плане не велі ўдалая. Будзь больш сістэмным у планах уводжання парадкаў у хатнім ладзе.

(22.05. — 22.06.) Пачнеш інтэнсіўна думаць аб інвестыцыях. 6-10.01.: прыйшоў момант, каб твае поспехі на працы былі падмацаваны ўзнагародай; пра што папросіш — усё дастанеш. З 8.01. (да 12.01.) не ўваходзь у ніякія фінансавыя суполкі з сябрамі, не ручайся сваёй маёмасцю, не пазычай грошай.

(23.06. — 23.07.) Не сядзі дома, бо цябе не ўбачаць і не знойдуць. Выдаваць грошы будзеш як шалёны, але адкладзеш і на чорную гадзіну! Нясмелыя Ракі могуць адкрыць свае пачуцці (6.01. — 10.01.); добры час таксама на супольнае планаванне. Новае каханне дасць табе крылы!

(24.07. — 23.08.) Нанова адкрыеш і ацэніш сваю сілу. Твае дзеянні будуць паспяховыя, ніхто цябе не падмане. Таксама блізкія падтрымаюць цябе, і з імі зробіш яшчэ больш. Праца захопіць цябе без рэшты, на дробязі часу не будзе.

(24.08. — 23.09.) Вельмі добра дагаворышся з іншымі, захопіш ведамі, творчым падыходам. Больш часу правядзеш з блізкімі. З 8.01. больш адкрыешся, што не будзе лёгкай справай. Месяц немалых выдаткаў, дык падцягні папругу.

(24.09. — 23.10.) Энтузіязм партнёра заінспіруе цябе да адважных дзеянняў. Калі мудра выкарыстаеш свой шанц, будзеш спакойны за фінансы. У каханні чакаюць цябе ўвесь месяц цудоўныя і нязведаныя перажыванні! Задбай аб здароўе, дыету.

(24.10. — 22.11.) Працягвай пачатыя планы, ажыццяўляй навагоднія рашэнні. Перашкоды зграбна абмінеш. Добрая памяць і ёмкі розум. У хаце спакойна. На працы шмат зваліцца на галаву, але тым больш будзеш знакамітым арганізатарам. Выдатна ў плане здароўя.

(23.11. — 22.12.) Пры любым напрамку ў сардэчных справах — усё будзе на тваім баку. Цяпер лёгка можаш пазбыцца дрэнных звычак. На працы, калі ўсё добра, нічога не змяняй, не рвіся на больш. Здароўе някеспкае, але не натужвайся.

(23.12. — 20.01.) Нагоды для паказання сябе, сваіх магчымасцей і талентаў. Знойдзеш адказ на турбуючыя цябе пытанні. У пачуццях слухай таго, што падказвае табе сэрца, а не розум ці знаёмыя. І не пляці зашмат пра тое, што робіш і чаго не робіш.

(21.01. — 19.02.) Гарачыя жарсці. Хоць не маеш галавы да інтарэсаў, грошы цябе не абмінуць. Стартуй з новымі помысламі, але не занядбоўвай старых. Не ўсе справы пойдуць па-твойму, могуць быць праблемы і з аплатамі.

(20.02. — 21.03.) 2-6.01. хтосьці табе шмат наабяцае; пазбягай фінансавых ходаў, не стамляйся, будзь больш крытычным. Будзе перапяўняць цябе пачуццё шчасця. Можаш забыцца пра крутыя павароты і паразы. Пачынаецца перыяд гіганцкага росту і развіцця (аж да пачатку наступнага года, з пару тыднямі перапынку); можаш узысці не толькі па прыступках кар'еры, але і сваіх магчымасцей.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960